


Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ

наша слова



Газета выходзіць з сакавіка 1990 года **№ 29(414)** **21 ЛІПЕНЯ 1999 г.**

На 20 ліпеня 1999 года

Народу можа засціць зрок
Без дай прычыны.
Ды бачыць Божа кожны крок
На звод Айчыны.

У вочы вам адплаты час
Зірне сурова.
Каб дзеці апраўдалі вас –
Вярніце мову.

Няма пачаткаў і канцоў,
Усё – працяг.
Каб не ўскіпела ў жылах кроў –
Вярніце сцяг.

Улады сверб, што вас скубе,
І славы сверб –
Пакіньце ўсё сваё сабе,
Вярніце герб.

Дальбог, пра гэта не са зла
Малюся ў скрусе,
А каб зямля вас прыняла
На Беларусі.

Уладзімір Някляеў.

Рок-акцыя ў Менску

У сувязі са зрывам 11 ліпеня Менскімі ўладамі рок-акцыі "Моладзь супраць фашызму" арганізатары мерапрыемства падалі ў Менгарвыканкам заяўку на правядзенне 28 ліпеня на пляцоўцы каля опернага тэатра з 15 да 21 гадзіны рок-канцэрта "Моладзь за незалежную Беларусь". Гэта акцыя прымеркавана да 9-й гадавіны прыняцця дэкларацыі аб незалежнасці Рэспублікі Беларусь. У гэтым канцэрце плануецца выступленне гуртоў NRM, "Новае неба", "Уліс", "Нейра-Дзюбель", "Зьніч", "Палац", "Крыві" і іншыя.

Даведкікі па тэл.: 284-50-12

Алесь Гурыновіч.

МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



МИНИСТЕРСТВО ЮСТИЦИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

13.07.1999. №06-10 БН

На №

СПРАВКА

Дана настоящим в том, что материалы "Общества белорусского языка имени Ф. Скорины" в настоящее время находятся на перерегистрации в Министерстве юстиции Республики Беларусь.

Заместитель начальника Управления общественных объединений Минюста Беларуси **Е.В.Короткова**



EÖTVÖS LORÁND TUDOMÁNYEGYETEM
BÖLCSÉSZETTUDOMÁNYI KAR
Keleti Szláv és Balti Filológiai Tanszék
1052 Budapest, Piarista köz 1.
Tanszékvezető: Dr. Zoltán András egyetemi docens
Tel./fax: (36-1) 2-66-89-81;
Tel. (36-1) 2-670-966/5106; 5383; 5022
E-mail: eastslav@isis.elte.hu

Кафедра ўсходнеславянскай і балтыйскай філалогіі
Будапешцкага універсітэта імя Лоранда Этвеша

6-7 красавіка 2000 г. арганізоўвае міжнародную канферэнцыю "Мовы ў Вялікім княстве Літоўскім і краінах сучаснай Цэнтральнай і Усходняй Еўропы: міграцыя слоў, выразаў і ідэй"

Канферэнцыя арыентаваная на тэматыку дакладаў лінгвістычнага і гісторыка-культурнага плана: ад асвятлення агульных пытанняў узаемадзеяння моў і культур у рамках адной дзяржавы (ці дзяржаў) да разгляду прыватных моўных з'яў у лексіцы, граматыцы, сінтаксісе і т.д. у гістарычна-параўнальным ці функцыянальна-супастаўляльным аспекце.

Тых, хто жадае ўзяць удзел у канферэнцыі, просім даслаць тэзы (да 2-х старонак) на адрас кафедры да канца кастрычніка 1999 г. Запрашэнні на канферэнцыю будуць высылацца на аснове дасланых тэзаў.

Мовы канферэнцыі: славянскія, нямецкая, ангельская.

Рэгістрацыйны грашовы ўнёсак для ўдзельнікаў канферэнцыі не прадугледжваецца. Пражыванне, харчаванне, праезд у абодва бакі аплачваюць удзельнікі канферэнцыі.

Будапешт, 19 красавіка 1999 г.

Ад імя аргкамітэта

Аранка ЛАЦХАЗІ Андраш ЗОЛТАН

6 ліпеня дзень нараджэння М.Шагала

У Віцебску 5 ліпеня пачаліся Міжнародныя Шагалаўскія дні. І адкрыліся яны дзіцячым Шагалаўскім пленэрам і літаратурна-музычным прадстаўленнем "У гасцях у Марка і Бэлы", якое прайшло ў двары дома-музея Марка Шагала. 6 і 7 ліпеня адбыліся Шагалаўскія чытанні, а таксама адкрыццё выставы "Марк Шагал і яўрэйская культура".

На здымках:

1. Фрагмент бюста "Марк Шагал і скрыпка" ў Віцебску.
2. Дом –музей М.Шагала ў Віцебску. Фота Аляксандра Хітрова, БЕЛТА, — О – ТА/ТМ





Старшыні Менгарвыканкама Ярмошыну У.В.
№ 360 9.07.

Паважаны Уладзімір Васільевіч!

Звярнуцца да вас нас вымушае нездавальняючы стан ужывання дзяржаўнай беларускай мовы ў Менску. На вялікі жаль, аўдыёвізуальнае асяроддзе горада з кожным днём становіцца ўсё больш і больш рускамоўным. Сталіца губляе свой нацыянальны каларыт і тым самым здзіўляе, а часам і расчароўвае настолькі, што іншы раз падумаецца, а ў якой краіне мы жывём. А менавіта ж беларуская мова, а не якая іншая, павінна быць гаспадыняй у візуальным і гукавым асяроддзі сталіцы. За апошнія гады пад Вашым кіраўніцтвам у гэтым накірунку тое-сёе робіцца, але ж, пагадзіцеся, вельмі марудна, як мокрае гарыць – кажуць у народзе.

Нас не ўпрыгожвае той факт, што буйнейшыя прадпрыемствы Менска, такія, як МТЗ, мотавелазавод, электратэхнічны і шмат іншых заводаў цалкам ігнаруюць беларускую мову ў візуальным аздабленні.

Вельмі прыкра, што пры замене шыльдаў з іх знікае беларуская мова. Напрыклад, "Мебель", што на Партызанскім праспекце, "универмаг Беларусь", універсам "Центральный", "улица Железнодорожная" і іншыя.

У шэрагу выпадкаў назіраецца разнабой у напісанні: "улица Короля" і вуліца У.Караля, "Улица Р.Слобода" і вуліца Рамаюўская Слабада.

Недапушчальныя і граматычныя памылкі на шыльдах: 2-ры завулак Летні, уліца Нямігі, вуліца Гандлёва Набярэжная. Правільна напісаць трэба так – 2-гі завулак Летні, вуліца Няміга, вуліца Гандлёва-набярэжная.

Незразумела, чаму да гэтага часу на станцыі метро "Плошча незалежнасці" не заменены яе старыя назоў. Людзі не разумеюць, чаму на гэтым прыпынку яны чуюць адно, а бачаць зусім іншае – па-ранейшаму тут застаюцца надпісы "ПЛОШЧА ЛЕНІНА", "ПЛОЩАДЬ ЛЕНИНА".

Пакуль што афармленне пераважнай большасці магазінаў, пачынаючы ад цэннікаў на таварах і канчаючы аздабленнем інтэр'еру і вулічнай рэкламы, — рускамоўнае.

Амаль поўнасцю адсутнічае беларуская гукавая інфармацыя на грамадскім гарадскім транспарце. У аўтобусах, тралейбусах, трамваях прыпынкі аб'яўляюцца па-руску, а вадзіцелі, якія робяць гэта па-беларуску, аніяк не заахвочваюцца.

Многія кіраўнікі дзяржаўных органаў, устаноў, прадпрыемстваў, а таксама іхні персанал не валодаюць беларускай мовай у аб'ёме, прадугледжаным артыкулам 4 Закона аб мовах, каб пісьменна афарміць дакумент па-беларуску, ці проста кантактаваць з беларускамоўнымі грамадзянамі. Гэта сведчыць, дарэчы, пра іх прафесійную непрыдатнасць. І гэта амаль праз 10 (!) гадоў пасля прыняцця Закона.

Факты прыведзеныя намі, тыповыя для ўсёй Беларусі. Па Менску ж іх столькі, што пералічыць немагчыма. І пакуль яны ёсць, мы мусім сцвярджаць, што ігнараванне мовы этнічнага насельніцтва працягваецца. Менавіта таму мы звяртаемся да Вас, кіраўніка выканаўчай улады ў нашай сталіцы, які, нам думаецца, у значнай меры павінен фармаваць палітыку ў галіне выкарыстання дзяржаўнай мовы і патрабаваць ад дзяржаўных і прыватных прадпрыемстваў і ўстаноў выканання адпаведных заканадаўчых актаў па ўжыванні беларускай мовы ў афармленні.

Думаем, што Вы падзяляеце нашую занепакоенасць, бо ведаем Вашую грамадзянскую пазіцыю, якую Вы выказалі ў свой час пры абранні на займаемую пасаду.

Спадзяемся, што Вы зробіце ўсё, што ад Вас залежыць, каб Менск быў сталіцай нашай дзяржавы не толькі намінальна.

Са свайго боку – прапануем супрацоўніцтва ў вырашэнні ўзнятых пытанняў. Мы таксама хочам ведаць:

- Як Вы ацэньваеце сітуацыю з беларускай мовай у Менску?
- Ці існуюць нейкія прававыя акты гарадской улады, накіраваныя на падтрымку выкарыстання беларускай мовы?
- Ці разглядаюцца на паседжаннях выканкама пытанні выкарыстання беларускай мовы ў афармленні горада?

17 чэрвеня 1999 года.

Сакратарыят ТБМ імя Францішка Скарыны.
Старшыня ТБМ імя Францішка Скарыны
А.А. Трусаў.

Слова пра сябра

Проста Марыя

Ніхто не зможа любае старонкі!

Я веру ў шчасны лёс твой, Беларусь,
Без гора, перастрэлак і разборак.
Не будзе прымусовым твой хаўрус,
Зямельку-маці не агорне морак.

Ніхто не будзе на кавалкі рваць,
Таптаць у бруд спрадвечныя святыні –
Сцяной паўстане беларусаў раць,
Навал варожых цёмны шквал адрыне.

Сінейшым стане ў жыце васілёк,
Наладзяць белы карагод рамонкі,
Сыны і дочкі вернуцца здалёк…
Ніхто не зможа любае старонкі!

Марыя Мацюкевіч.



Пад час знаёмства з Марыяй Сцяпанаўнай Мацюкевіч, яна папрасіла: "Завіце мяне проста Марыя". Так мне і ўрэзалася гэта ў памяць – "Проста Марыя", як нейкае атаясамленне з вядомым аднайменным кінафільмам. Калі гэта адбылося, я ўжо не памятаю – ці то ў першыя дні станаўлення нашага Таварыства, ці то на пасяджэннях сацыял-дэмакратычнай Грамады. Памятаю, як я тады недарэчна пакпіў з паходжання яе прозвішча. Але мой няўдалы гумар быў так лёгка абыграны еійнымі словамі, што мы весела пасмяяліся. Так і сталі сябрамі – сябрамі аднаго Таварыства, сябрамі адной партыі. Я не прыгадаю зараз ніводнага мерапрыемства, на якім бы не прысутнічала Марыя. Такая актыўнасць і такое пачуццё адказнасці не можа не здзіўляць. Жанчына, маці дваіх дзяцей, настаўніца – яна заўсёды знаходзіць магчымасць прыехаць у Менск аж з Салігорска, дзе жыве і працуе. Многія яе выступленні на пасяджэннях Рады ТБМ, з'ездах – своеасаблівы ўрок для мяне, бо іх абавязкова даведаешся што-небудзь новае.

Усе свае веды і здольнасці Марыя накіроўвае на тое, каб у нашым грамадстве панавала еднасць і адзінства. Яе праца на ніве беларускага адраджэння – важкі ўнёсак у справу рэалізацыі нацыянальнай ідэі. Шмат пакут зведала Марыя Сцяпанаўна ад тых, хто варожа ставіцца да гэтай ідэі. Я адчуў яе боль, як свой, пры расколе Грамады. Адбылося гэта пад час аб'яднання дзвюх партый – Грамада і Згода. Яе, як і мяне, хвалюе пытанне: чаму ў нашым грамадстве працягваецца падзел на сваіх і чужых, на сапраўдных і несапраўдных. Дзе тая сіла, якая па працягу апошніх гадоў раздзяляе не толькі грамадскія арганізацыі, але і ўвесь наш народ. Адкрыты ліст Марыі Мацюкевіч да Станіслава Шушкевіча, дзе яна ўздымала гэтыя пытанні, я ўспрыняў, як уласны крык душы. Але разважаўшы глыбей, суцешыў сябе тым, што гэта ўсё ж не раскол, а хутчэй аб'яднанне людзей па прынцыпу розных поглядаў на шляхі да агульнай мэты. Але ў сённяшніх варунках, на жаль, чым больш спрэчак наконт "шляхоў", тым больш аддаляецца час дасягнення гэтай мэты. І што тут не кажы – камусьці гэта на руку.

Ад Марыі я навучыўся стрымліваць свае эмоцыі, быць спагадлівым да субяседніка, дараваць памылкі. Я па-добраму зайздрошчу ёй, як выхавацельніцы. Яна выгадавала цудоўнага сына, якім можа ганарыцца. Я сустракаўся з ім, маладым прыгожым юнаком у вайсковай форме, з цікавасцю гутарыў, відаць яго ягоную грамадзянскую пазіцыю. А таму з упэўненасцю магу сказаць: такі не дазволіць сабе разганяць дубінкай удзельнікаў шэсцяў і мітынгаў. Пашчасціла і тым, каго вучыць Марыя Сцяпанаўна. На ўсё жыццё застанецца яна ў іхняй памяці, бо такія настаўнікі не забываюцца.

Марыя Мацюкевіч вядома ў рэспубліцы не толькі як грамадская дзеячка, але і як паэтка. Яе вершы пранікнуты шчырай любоўю да Бацькаўшчыны, прыроды і беларускага народа. У вершах Марыі – боль за лёс нашай краіны, клопат пра яе духоўныя скарбы.

Люд беларускі! Мой народзе любы!
Скажы, дакуль насіць ты будзеш грэх.
Дакуль маўчацьмеш, сцяўшы зубы,
Даруючы з святыняў нашых здзек?

Так у адным з вершаў звяртаецца яна да беларускага народа.

Марыя Мацюкевіч стварыла Салігорскую арганізацыю Таварыства беларускай мовы і па-сённяшні дзень з'яўляецца яе нязменным кіраўніком. За гэтыя гады яна не страціла імпэту і цярпення ў барацьбе за вяртанне роднага слова беларускаму народу. Бясспрэчна, яна застанецца ў гісторыі нашай культуры, як заснавальніца і выдавец рэгіянальнай газеты "Рагнеда", эпіграфам да якой абрала словы паэта-земляка Л. Шпакоўскага-Случаніна: "Памятай, беларус, што і ты чалавек, які можа сабой гаспадарыць!"

Сімвалічна, што поўня жыццёвага шляху Марыі адзначаецца 26 ліпеня – напярэдадні дня Незалежнасці Беларусі. Упэўнены – усе, хто ведае Марыю Сцяпанаўну Мацюкевіч, далучыцца да маіх слоў віншавання.

З юбілеем, наша дарагая сяброўка! Поспехаў табе, сейбіту разумнага, добрага, вечнага. Зычу моцнага здароўя, сямейнага дабрабыту, трываласці ў нялёгкіх жыццёвых варунках. Дай Бог табе ўбачыць плён сваёй нялёгкай працы і атрымаць заслужаную ацэнку не толькі ад сваякоў і сяброў.

Жыве Беларусь!

Першы намеснік старшыні ТБМ Мікола Лавіцкі.

Жыве Беларусь!

Унучцы Ганусьцы прысвячаю

"Гэй, жыве Беларусь!" –
Кліч нясецца над светам.
"Гэй, жыве Беларусь!" –
Звоніць кожны палетак,
Прамаўляе травінка,
Шапоча лісцінка…
Гэты кліч увабрала
У сябе аблачынка,
Разраслася вялікаю
Чорнай хмарай
І – "Жыве Беларусь" –
Гром з нябёсаў ударыў.
Ды, расквеціўшы луг
Каляровай вясёлкай,
Хмар ланцуг разарвала
Прамяністае сонца.
Немаўлятка Ганулька
Сядзіць у калясцы,
Разабрацца спрабуе,
Што гэта за ляскат.
Вачаняткі-іскрынкі
На бабулю ўздымае
Непаседа дзяўчынка,
Гарэза малая.
Склала бантыкам губкі,
Пазірае наўкола
І працягвае ручкі
Бабулі назола.
Жмурыць вочкі ад сонца,
Славіць хоча вясёлку
Ды шчабеча бясконца,
Вядзе з небам гамонку.
Прамаўляе Ганулька
Мовай ёй зразумелай,
Што жыве Беларусь шчэ,
Што яшчэ не памерла!

Марыя Мацюкевіч.

Павел Сцяцко,
доктар філалагічныхнавук, прафесар, намеснік старшыні Гарадзенскай абласной рады ТБМ імя Францішка Скарыны

"З чужой моўнай практыкі..."

Працяг

Прыймач і прыёмнік. Як ужо згадвалася, словы з каранёвую часткай ***–ём*** для беларускае мовы нехарактэрныя (параўн.: ***наймы*** і рас. ***наём, уздым – подъём*** ды падобныя). У "Беларуска-расейскім слоўніку" М. Байкова і С. Некрашэвіча (Мн.,1926.С.254) чытаем: "***Прыймо*** н.– ***приём***". І ў акадэмічным "Русско-белорусском словаре" пад рэдакцыяй Я.Коласа, К.Крапівы, П.Глебкі (М., 1953.С.507) бачым: "***Приём (действие) прыйманне, прыняцце; приёмный – прыймовы, прыймальны; приёмный день – прыймовы дзень, приёмная станция - прыймальная станцыя***". Ад асновы ***прыйм-*** (прыймальная станцыя) з дапамогаю прадукцыйнага суфікса ***–ач*** узнікла слова ***прыймач***. На ўзор ***рухач, капач, сякач, цягач, штурхач***. Акадэмічная "Беларуская граматыка" (Ч.1.Мн.,1985.С.236) лічыць, што аддзеяслоўныя назоўнікі з суфіксам ***–ач***, якія абазначаюць прадметы, прызначаныя для выкання адпаведнага дзеяння, складаюць прадукцыйны словаўтваральны тып. Аднаслоўная намінацыя магла ўзнікнуць і шляхам кандэнсацыі апісальнай назвы: ***прыймальны апарат*** (прыбор, прыстасаванне) – ***прыймач***. "Ведаючы гадзіну, спецыяльна слухалі перадачу, але гэта маглі рабіць толькі тыя, хто мае шматканальны прыймач (Наша слова. 1996.№2).

Слова ***прыймач*** з гэтым значэннем уласцівае і іншым славянскім мовам: украінск. ***приймач***, славацк. ***Prijimac***, чэшск. ***Prijimac***.

Згарнуўшы рукі ці склаўшы (злажыўшы) рукі? Нашыя слоўнікі расейскае ўстойлівае спалучэнне (сидеть) ***сложа руки*** перакладаюць амаль даслоўна: (сядзець) ***склаўшы (злажыўшы) рукі*** (РБС-82.Т.2.С.400). Між тым беларуская мова мае тут і сваё адмысловае выслоўе: (сядзець) ***згарнуўшы рукі*** (нічога не рабіць, перастаць дзейнічаць'). У аснове гэтага фразеалагізму – вобраз нябожчыка, якому згортваюць рукі (накладаюць адна на адну). Менавіта гэтае словаспалучэнне – ***згарнуць рукі*** – найбольш выразна перадае сэнс ***перастаць дзейнічаць***. Карыстаецца гэтым фразеалагізмам і класік нашай літаратуры, выбітны майстра мастацкага маўлення Кузьма Чорны. У яго васьмітомным зборы твораў чытаем: "Яна сядзела тады на камені, паклаўшы на прыпол згорнутыя рукі" (Т. 6. Мн., 1978. С.72). Гэтым выслоўем – (сядзець) згарнуўшы рукі – вельмі актыўна карыстаюцца і ў гаворках Зэльвеншчыны, прычым нярэдка і ў больш разгорнутым выглядзе: "От гультаіна гэтая Альжбета! Калі ні ідзеш каля яе хаты, то ўсё сядзіць і сядзіць згарнуўшы рукі, як той мярэц (в.Грабава)".

Пра блізкасць мовы жыхароў Зэльвеншчыны і насельнікаў Случчыны няраз згадваў знаны мовазнаўца і пісьменнік Мікола Лобан (загадчык сектара лексікалогіі Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі), калі прачытаў маю дысертацыю "Побытавая лексіка зэльвенскіх гаворак" (Мн.,1962. - 520с.).

Змарнаваць час, прабавіць час – а не ўбіць час (забіць час). 18 жніўня 1998 года ў газеце "Народная воля" быў змешчаны артыкул "Прыгоды чэхаў на Беларусі", падпісаны: Мілан Шчасны, выканаўчы дырэктар чэскай будаўнічай фірмы "Капучын". Тэкст напісаны ўвогуле на добрай беларускай мове (відаць, папрацаваў неблага і перакладчык і стыліст). Але ж … Вось гэтае ***ўбіць час*** – як тая лыжка дзёгцю: "Нашыя спробы неяк прыспешыць пераход мяжы канчаюцца загадам усёй нашай групе **сядзець** у машыне (пяць чалавек у " Шкодзе-Актавія"). Чакаем, назіраем з машыны, як мытнікі з вялізнымі шапкамі на галовах, ляніва пакурваючы, убіваюць час, замест таго, каб абцяжарыць сябе працай".

Устойлівае словаспалучэнне ***ўбіць час*** – калька з рас. ***убить время***, дзе другі кампанент яго заменены беларускім словам (***время – час***), а першы застаўся без перакладу. Відаць, аўтар (перакладчык) палічыў, што рас. ***убить*** і белар. ***ўбіць*** тоесныя словы. І атрымалася штучная сінтаксічная канструкцыя, якая па-беларуску не мае сэнсу.


Насамрач, рас. ***убить*** мае іншыя беларускія адпаведнікі. "Русско-белорусский словарь" пад рэдакцыяй акадэміка К.Крапівы (Мн.,1982.Т.2.С.506) падае: "Убить сов.1.(умертвить) забіць, мног. Пазабіваць; убить наповал – забіць напавал; 2. Перен. (уничтожить) знішчыць; нельзя убить нашу веру в будущее – нельга знішчыць нашу веру ў будучыню; 3. Перен. (глубоко огорчить, привести в отчаяние) прыбіць, прыгнесці, прывесці ў роспач; это известие его убило –гэта вестка яго прыбіла (прыгняла, прывяла ў роспач); 4. Перен. Разг. (потратить на что-л.) патраціць; (издержать – еще) расходаваць, выдаткаваць; (времени) змарнаваць; убить много энергии на что-либо – патраціць шмат энэргіі на што –небудзь; 5. (уплотнить, утрамбовать) рас. Убіць, утрамбаваць; 6. (покрыть) карт. Разг. Пабіць; убить туза козырем – пабіць туза козырам; <> убить время – змарнаваць час; убить молодость – змарнаваць маладосць ; убей меня бог — забі мяне бог; убить бобра – ашукацца". Гэты артыкул цалкам паўтораны і ў перавыданні РБС –93 (Т.3.С.570) і РБС – 98.

Як бачым, расейскаму дзеяслову з прыстаўкаю у- адпавядаюць у беларускай мове іншапрыстаўкавыя аднакаранёвыя дзеясловы (***забіваць, пазабіваць, прыбіць, пабіць***) ці словы з іншым коранем (***знішчыць, прыгнесці, патраціць, расходаваць, выдаткаваць, змарнаваць***). І толькі з адным значэннем (***уплотнить***) бачым і ў беларускай мове ***убіць*** (разам з ***утрамбаваць***).

У некаторых пісьменнікаў сустракаем аналагічную сінтаксічную канструкцыю ***забіць час*** (як адпаведнік рас. ***убить время***), дзе перакладчык, убачыўшы ў слоўніку толькі адзін – першы – беларускі эквівалент (рас. ***убить – забіць***), стаў сам дасловна перакладаць словаспалучэнне ***убить время*** і атрымаў ***забіць час***. Але калі б ён прачытаў увесь лексіграфічны артыкул з рэестравым словам ***убить***, то знайшоў бы якраз патрэбны беларускі адпаведнік, які тут даецца пасля значка ромба. <> ***убить время – змарнаваць час***. Да таго ж трэба ведаць, што фразеалагізмы не перакладаюцца дасло̂ўна (слова за словам), а падбіраецца іх сэнсавы эквівалент, ён звычайна розніцца нават у блізкіх мовах. Як і ў нашым выпадку: ***убить время – змарнаваць час.*** Апроч таго, тут бачым і іншыя: ***убить бобра – ашукацца.***

У некаторых славутых знаўцаў мовы на месцы ***змарнаваць час*** выкарыстоўваецца ***прабавіць час***: "Святлана зайшла да бацькі ў штаб, каб прабавіць час сярод сяброў ці хоць паласаваццa цукеркай Бандарэнкавага каня Лютага (Янка Скрыган. Ранішнія росы. Мн., 1965. С.67-88).

(Працяг у наст. нум.)



Заява Сакратарыята ТБМ

На Грунвальдскім полі была выратавана беларуская мова

У далёкім ліпені 1410-га года аб'яднаныя беларуска-польскія войскі з дапамогай літоўскіх і татарскіх атрадаў разбілі пад Грунвальдам знакамітае крыжацкае войска і выратавалі свае народы ад тэўтонскай акупацыі і асіміляцыі. Перамогшы ў гэтай бітве, беларускі народ не толькі захаваў сваю незалежнасць, але і сваю мову, культуру.

Мы добра ведаем незайздросны лёс прускай і цэлага шэрагу заходнеславянскіх моваў, якія былі знішчаны пасля нямецкай акупацыі тых земляў, дзе спрадвеку жылі іх носьбіты.

ТБМ не сумняваецца, што ў XXI стагоддзі незабыўная дата 15 ліпеня ўвойдзе чырвоным радком ва ўсе беларускія календары і стане афіцыйным дзяржаўным святам незалежнай, дэмакратычнай Беларусі.


МАРКІ – НОВАЯ СЕРЫЯ


Новая серыя паштовых марак "Віцебская школа жывапісу" ўводзіцца ў абарачэнне рэспубліканскім дзяржаўным аб'яднаннем Белпошта. На марках прадстаўлены рэпрадукцыі карцін мастакоў рознага напрамку, якія жылі ў Віцебску і стваралі там свае творы ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя.

На здымках:

Маркі з новай серыі "Віцебская школа жывапісу".

Фота Аркадзя Нікалаева, БЕЛТА, — О – ТА/ТМ





Наведалі пушчу і Каліноўскага

Бацькоўскі камітэт СШ №2 горада Масты ў асобе Міхаіла Гладухава і Уладзіміра Наўшовіка арганізаваў турыстычную паездку вучняў дзесятых – адзінацатых класаў усіх школаў горада ў Свіслач і Белавежскую пушчу. Для паездкі было адабрана 32 школьнікі, якія валодаюць беларускай мовай і яшчэ ведалі гісторыю нашага краю. Яшчэ ў паездцы ўдзельнічала чатыры настаўнікі. Першы дзень дзеці наведалі пушчу. Пабывалі ў вёсцы Камянюкі. Пабачылі там музей ды вальеры з жывёламі. Купаліся бадай што ў адзіным на Беларусі вадападзе, дзе вада падае з вышыні трох метраў. Начавалі на беразе цудоўнага возера. Тут жа сярод удзельнікаў вандроўкі прайшоў конкурс прысвечаны паўстанню 1863 года. На наступны дзень школьнікі пабывалі ў мястэчку Свіслач, дзе мясцовы краязнаўца Віктар Трышчановіч паказаў ім магілу Віктара Каліноўскага, брата Кастуся Каліноўскага, галоўнага ідэолага тагачаснага паўстання, які памёр ад сухотаў на яго пярэдадні. Дзеці пабачылі таксама будынак былой Свіслачскай гімназіі дзе навучаліся браты Каліноўскія ды рэшткі сялібы, якую адшукаў ды раскапаў доктар гістарычных навук прафесар Міхась Ткачоў.

Язэп Палубятка.

Незалежныя прафсаюзы гавораць па-беларуску

"Горача вітаем дэлегатаў і гасцей У з'езда БНП!" – кідаўся ў вочы плакат, напісаны па-беларуску. Два дні, 2 і 3 ліпеня, праходзіў у Салігорску форум прадстаўнікоў Незалежнага прафсаюза, якія прыехалі з усіх куткоў Беларусі. Мілагучнае беларускае слова гучала з вуснаў старшыні аргкамітэта па падрыхтоўцы з'езда Міколы Зіміна, які адкрыў гэтае важнае мерапрыемства. Абмеркаванне новай рэдакцыі Статута БНП, з якой знаёміў па-беларуску лідэр незалежнікаў Віктар Бабаед, стварала ўражанне, што хутка наша родная мова запануе, зойме належнае месца ў асяроддзі рабочых. Дай жа, Божа, каб спадзяванні спраўдзіліся, каб годнасць беларусаў абудзілася ў шырокіх масах насельнікаў нашай дзяржавы.

Шэсцьдзесят дэлегатаў і гасцей з'езда падпісаліся за стварэнне ў краіне нацыянальнага універсітэта і выказаліся супраць перайменавання праспекта Францішка Скарыны ў г. Менску. Некаторыя з іх паахвяравалі грошы на дзейнасць Таварыства беларускай мовы. Сабрана каля двух з паловай мільёнаў рублёў, з якіх адзін мільён унёс Мікола Зімін.

Марыя Мацюкевіч, госця У з'езда БНП, старшыня Салігорскай арганізацыі ТБМ.

Мова абараніла беларуса

Паважаная рэдакцыя!

Прапаную адчыніць рубрыку: "Замалёўкі з натуры". Наступны эпізод адбыўся на самай справе, аб чым я сведчу.

Беларуская мова – сродак ад ашуканства. На Віцебскім базары да маладога прыгожага хлопца падышла цыганка і паміж імі адбыўся наступны дыялог: "Молодой – красивый, дай погадаю, всю правду расскажу!" І пачула ў адказ наступнае: "Прабачце, я не разумею, што Вам патрэбна. Гаварыце па-беларуску".

А цыганка зноў да хлопца: "Ой, всё то ты понимаешь, дай руку, что было, что будет расскажу". Але хлопец вельмі ўпэўнена і, спакойна адказаў: "Шаноўная спадарыня! Мне вельмі цяжка размаўляць па-расейску. Калі ласка, калі Вам нешта патрэбна ад мяне, гаварыце па –беларуску!"

Жанчына засмучана адышла ад хлопца і пайшла шукаць новую ахвяру. Мова абараніла беларуса.

З павагай А.Грудзіна. Г.Шклоў, 29.06.99г.

"МАРК ШАГАЛ І ЯЎРЭЙСКАЯ КУЛЬТУРА"

У Віцебску ў рамках IX Міжнародных Шагалаўскіх дзён, у дзень нараджэння мастака – 6 ліпеня ў музеі Марка Шагала адбылося адкрыццё выставы "Марк ШАГАЛ і яўрэйская культура", дзе ўпершыню былі прадстаўлены 96 работ – ілюстрацый да "Мёртвых душ" М.Гогаля. Гэта падарунак Віцебску ўнучак вялікага мастака, а таксама шэраг літаграфій, падораных гораду куратарам музея Марка Шагала ў Еўропе Гюнтэрам Каматскі (Швейцарыя), доктарам Генрыхам Мандэлем (Германія).

На здымках:

1. Унучка мастака Мерэт Маер Грабер і куратар музея Марка Шагала ў Еўропе Гюнтэр Каматскі.

2. Работа М.Шагала.

Фота Аляксандра Хітрова, БЕЛТА. – О – ТА/ТМ





Распачаў працу Кніжны клуб ТБМ

У нядзелю 11 ліпеня а палове на шаснаццатую гадзіну ў сядзібе Таварыства беларускай мовы на Румянцава, 13 у Менску адбылося адкрыццё Кніжнага клуба ТБМ.

Каля двух дзесяткаў беларускіх кніжнікаў сталіся ўдзельнікамі першага паседжання клуба, галоўнымі мэтамі якога ёсць папулярызацыя беларускага прыгожага пісьменства, беларускай кніжнасці, а таксама – замежнай кнігі пра Беларусь. Перад пачаткам паседжання Кніжнага клуба кожны мог азнаёміцца з невялічкай, але значнай паводле свайго зместу выставай, сярод экспанатаў якой былі сапраўдныя рэліквіі: Імпал (богаслужбовая кніга) у перакладзе легендарнага беларускага ксяндза Уладзіслава Чарняўскага, выдадзены ў Вільні лацінкаю "Каляндар "Нашай Нівы" на 1915 год", спытак з яшчэ не друкаванымі вершамі вартаснага беларускага паэта з Навагрудка – Самсона Пярловіча. Цікава было пагартаць і франкамоўнае выданне, прысвечанае пяцісотгоддзю з дня нараджэння Францішка Скарыны, а таксама – тры невялічкія кніжкі на беларускай, ангельскай і польскай мовах (польскамоўны варыянт існуе толькі ў трох асобніках!), зместам якіх ёсць беларуская народная казка "Сіняя світа – налева пашыта".

Далей прысутныя атрымалі магчымасць падрабязна даведацца пра мяркаваную дзейнасць Кніжнага клуба, выказаць свае заўвагі і прапановы, надумаць над уласным удзелам у рэалізацыі праектаў клуба, сярод якіх: "Кнігаюша" – дапамога ў набыцці з найменшымі выдаткамі вартасных беларускіх выданняў і замежных выданняў пра Беларусь, супрацоўніцтва з беларускімі газетамі, часопісамі, выдавецтвамі, арганізацыя сустрэчаў з беларускімі творцамі літаратуры, выязныя паседжанні (вандроўкі) па літаратурных мясцінах Беларусі, асваенне беларускай літаратурай (у перакладах і ў арыгінале) прасторы Інтэрнету і інш.

З вялікай цікавасцю была ўспрынята звестка пра тое, што пры Кніжным клубе закладзена бібліятэчка рарытэтаў, карыстальнікамі якой могуць быць падпісчыкі газеты ТБМ – "Наша слова". Ужо зараз у бібліятэчцы знаходзіцца некалькі дзесяткаў старых беларускіх кніг 20-50-ых гадоў з геаграфіяй выдання ад Вільні да Мюнхена.

Напрыканцы паседжання Кніжнага клуба было праведзена анкетаванне і была прадстаўлена Хрэстаматыя беларускай прозы 20-ых гадоў – кніга, якая дазваляе зразумець усю шырыню, значнасць і, разам з тым, "нявымаўленасць" беларускага літаратурнага працэсу 20-ых.

Наступныя два паседжанні Кніжнага клуба ТБМ будуць мець тэмы – "Беларускія паэтычныя анталогіі", "Жыццё і творчасць Ларысы Геніюш", адбудуцца 25 ліпеня і 8 сакавіка адпаведна (нядзеля, праз тыдзень; з 15.30 да 17.30) у сядзібе Таварыства Беларускай Мовы ў Менску па адрасе: Румянцава, 13. Тэлефон для даведак і прапаноў: 84-85-11.

Зацікаўленых чытачоў ласкава запрашаем адказаць на пытанні першай анкеты Кніжнага клуба ТБМ:

1.Якая кніга, на Вашу думку, абавязкова павінна быць у бібліятэчцы Кніжнага клуба ТБМ?

2.Назавіце свайго любімага беларускага пісьменніка.

3.Якую беларускую кнігу, альбо замежную кнігу пра Беларусь Вы абавязкова жадаеце набыць для сваёй бібліятэкі?

4.Якая кніга Вас найбольш уразіла ў жыцці? Увага: пры адказе на гэтае пытанне можна назваць як кнігу беларускага, так і замежнага аўтара.

5.Ці з'яўляецеся Вы сталым падпісчыкам газеты "Наша слова"?

Адказы на анкету, калі ласка, дасылайце на адрасе: 220005, Менск, вул. Румянцава, 13, Кніжны клуб ТБМ.

Зміцер Цехановіч.

"Мелодыі Бацькаўшчыны"


З 15 ліпеня ў Менску ў нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі, які знаходзіцца па К.Маркса – 12 адкрылася выстава "Мелодыі Бацькаўшчыны", прысвечаная 180-годдзю з дня нараджэння сусветна вядомага кампазітара, нашага славутага земляка Станіслава Манюшкі. Наведвальнікі змогуць пабываць у музычным салоне XIX ст. адчуць атмасферу ў якой тварыў кампазітар. На выставе можна пабачыць палотнішчы мастакоў, музычныя інструменты і іншыя экспанаты.

20, 22, 27 ліпеня на гэтым мерапрыемстве адбудуцца канцэрты Менскага абласнога камернага хора "Санорус"

Выстава працуе ўсе дні акрамя серады з 11.00 – 19.00 да 1 верасня.

Даведкі па тэл.: 227-43-22.

Н.К.



№ 29(414) 21 ЛІПЕНЯ 1999 г. наша слова

Валянцін Грыцкевіч, дацэнт, сябар Міжнароднага ПЭН-клуба,сябар Саюза пісьменнікаў Беларусі, старшыня рады Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Пецярбургу, першы намеснік старшыні Міжрэгіянальнай асацыяцыі беларусаў Расеі

Лінгвацыд або знішчэнне мовы

(Заканчэнне. Пачатак у папярэдніх нумарах.)

А вось беларусы маўчаць. Цярпелі і не такое. Перацерпяць і зараз.

У этыцы існуе прынцып спачування. Пачынаецца ён з таго, каб здолець паставіць сябе на месца іншага і зірнуць на свет ягонымі вачыма. Калі я распавёў старшакласнікам двух пецярбургскіх школ аб моўнай сітуацыі ў школе і па-за школаю Беларусі і запытаўся ў моладзі: "Як бы вы аднесліся да таго, каб у будучай аб'яднанай Беларуса-Расеі вас перавялі на беларускую мову навучання, давалі чытаць пераважна беларускамоўныя кніжкі, часопісы і газеты, паказвалі б толькі беларускамоўныя тэлеперадачы?", я пачуў гул узбурэння.

У 30-я гады былі ліквідаванымі ўсе беларускія школы, што былі створаны на пачатку савецкае ўлады ў Сібіры і на Далёкім Усходзе ў месцах кампактнага пражывання беларусаў. Ніхто з навакольных жыхароў гэтых беларусаў не бачыў у гэтым несправядлівасці.

Паколькі ад паступлення ў вышэйшую навучальную ўстанову залежыць далейшы лёс выпускнікоў сярэдняй школы, а выкладанне ў вышэйшай школе вядзецца выключна па-расейску, бацькі вымушаны ўжо дзесяцігоддзямі адмаўляцца ад таго, каб іхнія дзеці навучаліся ў школе на роднай мове.

Здаецца, планы апякуна Віленскай навучальнай акругі Навасільцава яшчэ ад 1831 года, улічаны савецкай і пастсавецкай уладаю Беларусі. Гэты чыноўнік калісці пісаў: "Надобно, начиная с университета, вводить преподавание на языке русском, ибо разность в языках всегда питает взаимную недоверчивость. Филологическое исследование языка и даже его простое изучение пробуждает исторические воспоминания о некогда бывшей самостоятельности и независимости государства".

Добра казаў граф Навасільцаў...

IX. ДЭМАГРАФІЧНАЯ ПАЛІТЫКА

Дэмаграфічная палітыка адносна беларускага этнасу праводзілася па прынцыпу: "Мой адрас не дом і не вуліца, мой адрас Савецкі Саюз".

Тыя, хто дамагаліся на рэферэндуме 1995 г. ураўнования ў правах дзяржаўнай мовы рускай і беларускай моваў, спасылаліся на тое, што ў Беларусі жыве шмат расейцаў.

Гэта так. Расейцы пачалі перасяляцца масава ў Беларусь здавён. З канца XVII ст. яны уцякалі туды, шукаючы прытулку ад рэлігійнага і, галоўнае, ад дзяржаўнага ўціску царскіх уладаў.

Па афіцыйных расейскіх крыніцах XVIII ст., тады перасялілася з Расеі ў Беларусь не менш за сто тысячаў і не больш за мільён чалавек.

Але вось што дзіўна. Па іншых крыніцах не ўдалося знайсці слядоў захавання расейскае адметнасці гэтых уцекачоў (апроч нешматлікіх пасяленняў стараабрадцаў), значэнне якіх у перасяленнях значна перабольшана). У чым справа?

Хутчэй за ўсё таму, што гэтыя людзі хутка асіміляваліся ў беларускім асяроддзі. Іх не падтрымлівала адукацыяй ці царквою Расейская дзяржава.

Масавыя перасяленні рускіх у Беларусь спыніліся пасля прыяднання яе да Расеі. Узнавіліся масавыя перасяленні толькі пры савецкай уладзе.

А пры царызме ў Беларусь ехала чынавенства, святары, настаўнікі, якіх прыахвочвала да гэтага царская ўлада. І здаецца, мае рацыю С. Дубавец, калі піша:

"Видя и зная теперь характер этого нашествия, можно ли допустить, что это было "освобождение" или "воссоединение с Россией", — как толковала нам прежняя пропаганда? Можно ли говорить о каких то благотворных плодах этого нашествия, как, впрочем, и всех последующих административных нашествий с "большой земли"?

В сущности, ответом на эти вопросы и будет то, почему мы не стали русскими. Потому что вместо русской природы языка, культуры нам предлагались природа, язык и культура чиновничества. Мы, народ, превращались не в русских, а в денационализированных чиновников – вбирая в себя эту психологию, этот тип достоинства и ценностей. Они входили в нас не вместо нашей белорусской сути, а лишь потеснив ее, приглушив своим объемом, своей массой. Мы так и не почувствовали ничего русского в себе."

У свою чаргу расейскія ўлады перасялялі беларусаў па-за межы Беларусі. Пэўная частка дробнай шляхты была перасяленай царызмам у Херсонскую губерню і на Паўночны Каўказ пасля паўстання 1831 г. Другую "партыю" шляхты і аднадворцаў перасялілі пасля тлумлення паўстання 1863 г. Царызм заахвочваў перасяленні беларускіх сялян у Сібір і на Далёкі Усход на пачатку XX ст.

Савецкая ўлада працягвала гэтую палітыку. У ходзе рэпрэсій пад час калектывізацыі з Беларусі было выселена шмат людзей. Тое ж паўтарылася ў 1940-я гг. пасля прыяднання да СССР Заходняе Беларусі.

Беларусаў высялялі з родных мясцінаў пад выглядам вярбоўкі на шахты, навабудовы, лесапавал у тайзе, асваенне цалінных зямель і г.д.

Усё гэта прывяло да змяненняў суадносінаў у Беларусі беларусаў і расейцаў. За годы савецкае ўлады колькасць апошніх павялічылася да мільёна 300 тысячаў.

Усё гэта абгрунтоўвалася патрабаваннямі да забяспячэння расейцаў у Беларусі адпаведнымі ўмовамі для расейскамоўнае адукацыі, друку, сродкаў масавай інфармацыі на іхняй роднай мове.

X. УРАЎНАВАННЕ МОВАЎ

Беларусь ужо мела досвед "ураўнавання моваў" у афіцыйным ужытку. 29 жніўня 1696 г. усеагульная канферэнцыя саслоўяў (сейм) Рэчы Паспалітай абвясціла, што ў справаводстве Вялікага княства Літоўскага "цяпер усе рашэнні павінны складацца на польскай мове. Усе папярэднія акты, запісы, рашэнні і паказанні захоўваюць сваю моц"

У гэтай і іншых дзяржаўных пастановах пра забарону беларускай мовы гаворка не ішла. Больш за тое, беларуская мова на працягу ўсяго XVIII ст. ужывалася ў справаводстве, рукапісах, асобных друкаваных выданнях. На ёй ствараліся беларускія інтэрмедыі, парадыйная паэзія і проза, казані, песні і вершы, тлумачальныя слоўнікі і дапаможнікі.

Аб гэтым сведчаць наступныя прыклады. У пастанове Пінскае кангрэгацыі 1791 г. казалася, што настаўнікамі могуць быць толькі тыя асобы, што валодаюць польскай і беларускай мовамі. Слуцкая праваслаўная кансісторыя (1791) загадала пераклаці ўніверсал сейма Рэчы Паспалітай на беларускую мову.

Калі за сем год да таго кароль і вялікі князь Станіслаў Аўгуст наведаў Палессе, дык ягоную дарогу з Пінска да Крыстынопаля аздобілі надпісамі на польскай, лацінскай, беларускай і старажытнагабрэйскай мовах.

Але з апошняй трэці XVIII ст. польская мова ўсталёвалася ў школах Беларусі. Паланізацыя школ атрымала найбольшыя поспехі пры актыўнай падтрымцы царызму пасля прыяднання Беларусі да Расеі. Толькі пасля тлумлення царызмам паўстання 1831 г. ягоная палітыка ў дачыненні да паланізаванае беларускае шляхты рэзка змянілася. Паланізацыя скончылася. Пачалася русіфікацыя.

Вось чым абярнулася колішняе "ўраўнаванне моваў" 1696г.

Што да сучасных поглядаў на ўраўнаванне моваў, дык варта прывесці довады на ягоную карысць. Напрыклад, беларускі экзарх Філарэт у адным са сваіх інтэрвію так тлумачыў гэта:"Выдаленне з практыкі расейскай мовы я разумею, як нешта такое, як брак павагі да расейцаў, якія тут жывуць. Уклад расейскай супольнасці (грамады) у Беларусі – як бы гэта сказаць – у арганізацыю Беларускай рэспублікі, пабудову яе эканамічнай, навуковай, культурнай базы вялізны. Так хутка гэта ўсё не перакрэсліць."

Калі інтэрвіюер запытаўся ва Ўладыкі: "Які варыянт быў бы найлепшым? Утрыманне дзвюх дзяржаўных моваў?", ён атрымаў адказ: "Было б справядліва, калі б абедзьве мовы прызналі дзяржаўнымі".

Як вядома, гэта было здзейснена праз два гады пасля публікацыі гэтага інтэрвію.

Як тут не прыгадаць казку пра лісу, якая пасялілася з хатцы зайца, зрабіла пэўныя прыбудовы да хаткі, не зусёды прыдатныя для зайца. Толькі ў казцы няма таго, што ліса дамагалася, каб лісіная мова была ўроўненай з заячаю.

Добра было б, калі пры належнай дзяржаўнай увазе да расейскай мовы ў Беларусі не меншая ўвага удзялялася б беларускай, для 1 млн. 200 тысяч беларусаў, якія жывуць у Расеі (гэта амаль столькі ж, скольки расейцаў жыве ў Беларусі).

Што да беларусаў у Расейскай Федэрацыі, то я прыгадаю, як спрабавалі беларусы Пецярбурга адкрыць праваслаўную царкву пры беларускім прыходзе, але царкоўныя улады перарабілі прыход на расейскі. У Расейскай Федэрацыі няма аніводнай дзяржаўнай беларускай школы, аніводнай дзяржаўнай беларускай бібліятэкі, аніводнай беларускай дзяржаўнай праграмы з беларускаю моваю на радыё і тэлебачанні, аніводнага беларускага тэатру, аніводнай кафедры або курсу беларусаведы ў шматлікіх расейскіх вышэйшых навучальных установах. Аніводная вышэйшая вучэльня Расеі не выкладае беларускае мовы, культуры, гісторыі, не гледзячы на намаганні беларусазнаўцаў Пецярбурга і Масквы адкрыць нешта падобнае, калі не кафедру, дык хоць спецыялізацыю. У гэты жа час у ВНУ Масквы і Пецярбурга з поспехам вывучаюцца мовы і культуры шмат якіх афрыканскіх і азіяцкіх этнасаў.

Для параўнання: у дэмакратычнай Польшчы, дзе жыве ўчацвёра менш беларусаў за Расею, пасля падзення камунізму працуе шэсць кафедраў беларускай культуры ў ВНУ пяцёх гарадоў. Туды ездзяць пецярбургскія беларусазнаўцы для чытання лекцый, але не чытаюць іх у сваіх гарадах. У Варшаве і Беластоку працуе беларускае радыёвяшчанне. Выходзяць беларускія газета і часопіс. Існуюць беларускія царкоўныя прыходы, працуюць беларускія школы. У Таліне ёсць беларускае радыёвяшчанне, у Латвіі і Летуве працуюць беларускія школы, у Вільні ў адным з ВНУ рыхтуюць беларускіх настаўнікаў.

У Расеі – хіба як на замену сапраўднаму клопату аб развіцці беларускай мовы і культуры – увесь час заклікаюць да дзяржаўнага аб'яднання з Беларуссю. Што можа чакаць беларускую мову і культуру ў аб'яднанай Беларуса-Расеі пры сённяшніх адносінах да беларускай мовы і культуры і ў Беларусі, і ў Расеі, прадбачыць зусім нецяжка.

XI. "СВАБОДА ВЫБАРУ МОВЫ"

Сапраўдная свабода выбару мовы магчымая толькі на правах роўнапраўнасці моваў. Гэтага не бывае ў аніводнай шматнацыянальнай дзяржаве. Там немінуча існуе прыцісканне і нават знішчэнне іншых нацыянальных культур, моваў, перадавых мысляроў асобаў, якія не належаць да пануючай нацыі.

Словы пра правы чалавека ў выбары мовы іканавалі ў законах СССР і другой Рэчы Паспалітай (Польшчы ў 1918-1939гг.). Рэальная рэчаіснасць заўсёды зводзілася там да выбару для ўжывання зусім не беларускай мовы. Гэта прыводзіла да дэнацыяналізацыі і асіміляцыі беларусаў суседнімі народамі.

Адным з ключавых словаў у савецкай літаратуры па пытаннях гісторыі і мовы было слова "добраахвотны". "Добраахвотна" нерасейцы прыядноўваліся да Расеі. "Добраахвотна" на ролю спосабу міжнацыянальных зносінаў была абрана расейская мова. Звычайная логіка тых, хто заняволівае іншых: маўляў, ахвяра сама прасілася пад ярмо.

Сёння, калі можна пачуць размовы пра правы асобы, часам з ёю звязваюць свабоду выбару мовы. На ўвазе маецца адно: як бы, жывучы ў Беларусі, не вучыць і не карыстацца беларускаю моваю.

Але супрацьстаўленне правоў нацыі правам асобы ўзнікае часцей за ўсё ў каланізатара. Гэта ён лічыць асобаю перадусім каланізатара і патрабуе ўсіх тых правоў, якія маюць жыхары калоніі, не адмаўляючыся, зразумела, ад правоў каланізатара.

Чаму да галавы не прыходзіць такая думка ў тых краінах, дзе з правамі чалавека ўсё нармальна? Чаму грамадзяне былога СССР не абураюцца, калі ў ФРГ ці ЗША, каб уладкавацца на працу, трэба здаць экзамен па нямецкай і англейскай мовах?

Прыязджайце, калі ласка, да якой-небудзь еўрапейскай або амерыканскай краіны і патрабуйце, каб з вамі размаўлялі "нормальным языком", гэта значыць, вашай моваю. І каб у школе і універсітэце выкладанне ішло таксама вашым "нормальным языком". "Свабода" выбару мовы ў сучаснай Беларусі азначае свабоду нявыбару беларускай мовы. Дэмакратычны лозунг прыйшоў на месца колішніх непрыхаваных і прыхаваных прапановаў асімілятараў.

XII. ІНШЫЯ ФОРМЫ ЛІНГВАЦЫДУ

Лінгвацыд ажыццяўляецца шматлікімі спосабамі. Мовазнаўства на службе асіміляцыі ўсе іх пералічыць цяжка. Сярод іншых апроч пералічаных спосабаў лінгвацыду можна назваць ператварэнне мовазнаўства на паслухмяны інструмент русіфікацыі беларусаведы.

Мовазнаўцаў-беларусістаў фізічна знішчалі. Адбывалася гэта яшчэ за сталінскімі часамі. Былі пастраляныя:

- аўтар "Беларускай граматыкі для школ" Браніслаў Тарашкевіч, прапанаваны ім правапіс быў заменены прыгаданай вышэй "наркомаўкаю",
- Язэп Лёсік, аўтар "Практычнай граматыкі беларускай мовы",
- Максім Гарэцкі, складальнік беларуска-расейскага і расейска-беларускага слоўнікаў,
- Сцяпан Некрашэвіч, аўтар такіх жа слоўнікаў.

Арыштоўваўся сааўтар М.Гарэцкага і С. Некрашэвіча па гэтых слоўніках расеец з паходжання Мікола Байкоў.

Быў рэпрэсаваным Іваан Бялькевіч, аўтар "Краёвага слоўніка усходняй Магілёўшчыны, — Шмат іншых беларусазнаўцаў было рэпрэсавана і загінула ад рук чырвоных катаў.

Іхняе месца заступілі мовазнаўцы, якія прапагандавалі "узбагачэнне" беларускай мовы за кошт расейскае і абгрунтоўвалі гэта тым, што апошняя "па сваім багацці, па грандыёзным значэнні тых каштоўнасцяў, што створаныя на гэтай мове, займае адно з першых месц сярод вядучых моваў свету", (Н. Крукоўскі, 1958).

Адным з галоўных кірункаў здзяйснення лінгвацыду была і застаецца барацьба з друкаваным словам.

У 1839 г. епіскап Язэп Сямашка па ініцыятыве шэфа жандармаў Бенкендорфа касуе Берасцейскую рэлігійную унію. Па сведчанні Р.Зямкевіча (1919) "Сямашка паліў на двары свайго палацу (у Жыровічах – В.Г.) уніяцкія беларускія абразы, гравюры і кніжкі, якія цяпер бібліёграфы не могуць знайсці (лік знішчаных старабеларускіх кніжак, цяпер нікому невядомых, апрача загалоўка, перавышае пяць тысяч экзэмпляраў)". А. Мальдзіс, з кнігі якога пазычана гэтая цытата, лічыць лічбу пяць тысяч падвышанаю, але заўважае, што "няма дыму без агню".

А ў XX стагоддзі няўхільна памяншаліся наклады беларускамоўных ад 68,5% выданняў у БССР (1925) да 7% у 1987г.

Тое, што друкавалася беларускаю моваю, ўяўляла сабою галоўным чынам пераклады класікаў марксізму-ленінізму, верных ленінцаў агітацыйна-прапагандысцкую і сацрэалістычную мастацкую літаратуру.


Гэтая друкаваная прадукцыя кідала цень на мову, якой яна друкавалася. Як адзначыў расейскі эмігранцкі філосаф Георгій Фядотаў: "Дзесяткамі моваў Саюза павінны былі друкавацца і чытацца толькі зборы твораў Маркса і Леніна. Гэта было дасягнута з одамі Сталіну ў дадатак. Для гэтага трэба было задушыць нацыянальныя літаратуры (асабліва украінскую і цюркскую), знішчыўшы значную частку іхняй інтэлігенцыі".

Ці палепшыліся справы пасля абвяшчэння Беларуссю незалежнасці? У першыя годы – так. Але, пачынаючы з 1994 г., усё пайшло па вядомай наезджанай каляіне. Толькі з 1995 на 1997 г.г. наклады беларускамоўных выданняў паменшыўся з 12,5% да 5,5% (ад агульнага ліку), стаў меншым нават за 1987 года.

Гадавы наклад газет (выданняў) беларускай моваю за той жа час паменшыўся з 322 да 272 мільёнаў асобнікаў. 2

Каб не было чаго чытаць (а ў нашы часы яшчэ і слухаць і глядзець) беларускай моваю, механізм русіфікацыі працаваў і працуе на поўную моц. Гэтая праца цягнецца дзесяцігоддзямі і нават стагоддзямі, калі лічыць ад першага падзелу Рэчы Паспалітай і ўвядзення расейскіх школ па-перш на тэрыторыі Магілёўшчыны і Віцебшчыны.

Гісторыя лінгвацыду ў дачыненні да беларускае мовы адназнакава сведчыць пра тое, што адзіным і найбольш трывалым чыннікам супраць яго ёсць дзяржаўнасць нацыянальнай мовы. Супрацьстаяць адкрытаму ці прыхаванаму лінгвацыду можна толькі, маючы пэўную сістэму ведаў і ўсведамленне таго, чым з'яўляецца мова, як і па якіх законах яна жыве, якая яе роля ў жыцці чалавека і нацыі. Аб гэтым і пойдзе гаворка ў наступных артыкулах, якія прысвечаныя такім тэмам як: "Што такое мова", "Навукі пра мову" і г.д.



Дзень добры, ТБМ

Піша Вам прыхільнік панавання беларускай культуры і гісторыі. Я ведаю, што ТБМ ладзіла пікеты ў гонар захавання назову, галоўнаму праспекту Менска Ф.Скарыны. Але мне не атрымалася на гэты пікет патрапіць. Як бы гэта можна было б зрабіць, каб у газеце "Наша слова" надрукаваць нейкі бланк, на які можна было бы пазбіраць подпісаў у абарону назова праспекта. Я ведаю шмат людзей бы паставіла свае подпісы, каб захаваць назву праспекта Ф.Скарыны.

І другое невялікае пытанне. Чаму не можна друкаваць газету "Наша слова" на сапраўднай беларускай мове, а не на наркомаўцы.

З павагаю Валодзя Бандарчык. Менск.

Сакратарыят ТБМ і рэдакцыя газеты просіць сваіх чытачоў не застацца ў баку ад гэтай праблемы і накіроўваць аркушы з подпісаміў сядзібу ТБМ па адрасу: г. Менск, вул Румянцава, 13, або ў рэдакцыю газеты "Наша слова".

Аркуш пратэсту

для збору подпісаў супраць перайменавання праспекта імя Францішка Скарыны ў Менску

Мы грамадзяне Беларусі, рашуча пратэстуем супраць спробаў афіцыйных уладаў краіны перайменаваць галоўны праспект імя Францішка Скарыны.

Мы лічым, што гэтая ганебная акцыя скіравана супраць усяго беларускага народа, ягонай духоўнай і культурнай спадчыны.

Патрабуем неадкладна спыніць захады па вынішчэнні з народнай памяці імя славутага сына Беларусі і захаваць імя Ф.Скарыны ў назве галоўнага праспекта нашай сталіцы.

№	Прозвішча, імя	Адрас пражывання	Дата падпісання	Подпіс

Слова на дзень маткі

Гэты артыкул, напісаны вядомай дзеячкай беларускага адраджэння, якая зараз жыве ў Канадзе, сп. Раісай Жук-Грышкевіч упершыню быў надрукаваны у газеце "Беларус" у далёкім 1967 годзе.

Але актуальнасць ён не згубіў нажаль і сёння, асабліва пасля сумнавядомага "рэферэндуму" 1995 г.

Зараз лёс беларускай мовы, як і раней, залежыць ад беларускіх жанчын. Калі яны, ня гледзячы ні на што будуць са сваімі дзецьмі размаўляць па-беларуску, нам нішто не будзе пагражаць. У якасці прыкладу можа правесці курдскіх жанчын. Нягледзячы на забарону курдскай мовы ў Турцыі, Сірыі і Іраку кожны курд ёй валодае і не думае забываць. Дык будзем падобныя на гэтых мужных людзей.

Алег Трусаў, старшыня ТБМ.

Ужо гэтак чалавек створаны, што па сваёй натуры хоча быць лепшым. Хоча прынамся ў вачох людзей выглядаць болей вартасным. Таму чыесьці пахвалы й камплімэнты мімаволі робяць нам прыемнасць, а нагана й крытыка – прыкрасьць.

Чалавек мае фізічныя й духовыя вартасьці, якія ён стараецца ўсьцяж разьвіваць і ўзмацняць. Фізічныя – гэта вонкавае прыгаство, грацыя, у мужчын – сіла. Не дарма мільёны даляраў жанчыны штогод трацяць на касмэтыкі, а другія мільёны – на прычоскі. Усё на тое, каб узмоцніць, увыпукліць сваё вонкавае прыгаство, якое, аднак, паміма ўсіх стараньняў, зь векам вяне, каб зусім загаснуць.

Духовыя вартасьці, як інтэлект – розум, веда, мудрасьць, — характар – прынцыповасьць, справядлівасьць, дабрата, — ды ідэйнасьць, калі пра іх дбаеш і іх разьвіваеш, зь векам збольшваюцца й набіраюць моцы. Яны, калі асабліва высокія, моцуць пераждыць самога чалавека, каб вякамі трываць у памяці новых пакаленьняў.

Духовыя вартасьці падкрэсьліваюць і ўзмацняюць фізічныя. Прыгожая дзяўчына з духовай культурай выглядае лепей, як прыгожая бяз культуры. Дабрата лагодзіць рысы й сонцам сьвеціць у вачох, а злосьць і ненавісьць ня толькі атручвае душу, але й вонкавае прыгаство. Мастачка – сьпявачка ці балетніца – у часе выконваньня свайго майстэрства набірае асаблівага чару, што мы часта ня ведаем, што нас захапляе: яна ці ейнае мастацтва.

Духовыя вартасьці, хоць міжсобку цесна зьвязаныя мы падзелім на дзьве групы: інтэлект і ідэйнасьць. Інтэлект – веда, розум – адрозьнівае нас ад жывёлы. Ідэйнасьць ставіць адзнаку яшчэ на вышэйшы ўзровень чалавецтва. Высока ідэйныя людзі ўзьнімаюцца гэтак высока над намі, што мы іх ня можам не дарыць пашанай, любоўю й абагаўленьнем. Але яны, з другога боку, сьцягваюць на сябе людзкую зайздрасьць, ненавісьць і варожасьць (каб мець ворагаў, трэба мець пазытыўныя вартасьці). Гэткімі высока ідэйнымі людзьмі былі: як чалавек, Ісус Хрыстос – яго абагаўлялі й яго расьпялі, гэткім быў Сакрат, Францішак з Асізу, гэткай была Еўфрасіньня Полацкая, Цётка, гэткім быў Янка Купала. На чым палягае іхняя веліч? На тым, што яны жылі для ідэі, у якую верылі, і для яе памíралі. Яны былі асілкамі духа. Гэткай сілай й прыгажосьці кажны мець ня можа, але ў натуры чалавечай ёсьць імкненьне мо' вынікаючае з жаданьня несьмяротнасьці, ісьці сьлядамі асілкаў. Таму й жывуць у нашай памяці. Спытаем, калі мы ўжо так імкнемся быць высокавартаснымі, дык чаму-ж мы ўсе імі ня ёсьць? Таму што цяжка й балюча падымацца на вышэйшы шчэбель чалавецтва. Таму, што найлягчэй і найвыгадней – поўзаць пры зямлі. Падымаючыся ўвысь, можна паламаць і пабіць сабе крылы й каленькі, а пры зямлі гэтая небясьпека не пагражае. Але затое, хто зь лянівае выгады ніколі не падымаецца ўвысь, той ніколі не зазнае прыгаства воблакаў і неба. Таму дзеля гэтага "неба" людзі, хоць з болем, але вучацца, хоць з болем, але хочуць быць вартаснымі, хочуць хоць у вачох іншых выдавацца ідэйнымі.

Каб узбагаціць сябе ведаю, трэба вучыцца. Гэта ўжо ня так і скамплікавана: узяць кніжку, сесьці й вучыцца, але навучыцца нечага новага, мазгі баляць. Мы баронімся ад гэтага болю й апраўдваемся, што я ўжо за стары, каб новага вучыцца. Добра, але памятай, што так жаданае пашаны іншых (а хто яе не жадае!) не здабудзеш. А каб падняцца на яшчэ вышэйшы ўзровень чалавецтва, трэба патрапіць даваць зь сябе й сябе. Трэба ахвяраваць сваю выгаду, свой час, сваю прыемнасьць, сваю працу, свой запрацаваны грош. Ахвяраваць сябе куды трудней і балючэй, як нельга навучыцца. Таму людзей асабліва высока ідэйных меней, як людзей зь ведай і розумам.

Найбольшай сілай і рухавіком, што ўзьнімае нас уверх, што дае нам сілы рабіць чуць ня немагчымае, ёсьць любоў. Любоў да маткі да дзіцяці, а дзіця да маткі ёсьць у нас уроджанай, арганічнай, гэтаксама, як уроджанай і арганічнай ёсьць любоў да свайго краю, свайго народу, свае мовы, усяго, як кажуць, свайго роднага. Гэтую любоў мы завем патрыятызмам. Слова паходзіць з лацінскай : патрыя – Бацькаўшчына, а патрыятызм – любоў да Бацькаўшчыны. Хтосьці сказаў трапна, што хто не патрапіць падняцца да вышыні патрыятызму, той нікуды не патрапіць падняцца. Вечна будзе толькі поўзаць. Патрыятызм ёсьць сыноўскай любоўю, і тыя, што ня любяць свае Бацькаўшчыны й усяго свайго роднага, вырадныя сыны й дочкі свае Маткі, свае нацыі, гэта біблійныя "блудныя сыны". У добрай сям'і бацькі, а асабліва маткі, вучаць сваіх дзяцей, як і Бог у 10-цёх Запаветах наказвае, любіць і шанаваць сваю матку й бацьку. Яны вкучаць сваіх дзяцей любіць і шанаваць сваіх братоў і сясьцёр, сваю Матку Беларусь і свой народ. Вучаць сваіх дзяцей і словамі і прыкладам.

Каб нешта ці некага палюбіць, трэба сьпярша яго пазнаць. Каб твае, матка, дзеці палюбілі сваю Беларусь, яны мусяць пазнаць сваю мову, культуру й гісторыю свайго народу. Ніхто іншы, як ты, матка, маеш узгадваць у сваіх дзяцёх любоў да Беларусшчыны. Але гэтую любоў ты мусіш мець сама. Тады яна перадасца тваім дзяцём разам з тваім малаком і калыханкамі. Перадасца яна – любоў да Бацькаўшчыны – твайму дзіцяці прыкладам твае ахвярнасьці й адданасьці беларускай справе. Дзеціназіраюць за сваімі бацькамі й ідуць іхнімі сьлядамі. Калі ты бярэш дзейны ўдзел у грамадзкім жыцьці, ты іх змалку прывучаеш да грамадзкае працы. Тое, што навучыліся ад свае маткі й бацькі таго мы ніколі не забудзем. Калі яны навучылі нас любіць і даражыць усім, што беларускае, ніхто й нішто гэтае любоўі ад нас не забярэ. А любоў, як мы ўжо гаварылі, і ёсьць той сілай, што дае нам крыльлі й узьнімае нас увысь.


Дык варта сяньня й спытаць сябе, а які-ж прыклад мы даём нашым дзецям? Ці гэта ёсьць прыклад стойкасьці Беларусшчыне, ці гэта ёсьць прыклад руплівасьці, ахвярнасьці й гатовасьці служэньня беларускай справе наперакор цяжкасьцям і прыкрасьцям? Ці гэта мо' ёсьць прыклад хаваньня сябе за чыесьці плечы: няхай іншыя запісваюцца ў беларускія арганізацыі, а я так збочку буду прыглядацца. У мяне яшчэ не хапае нацыянальнай гордасьці, не хапае на'т пашаны да свайго. Душой я яшчэ ня вольны, душой я яшчэ раб. Барані нас Божа ўзгадоўваць рабства ў нашых дзяцёх!

Можа хто з нас думае сабе: нашто мне гэта ўсё здалося? Я й мае дзеці абыйдуцца й без патрыятызму й без Беларушчыны. Што я бяз гэтага жыць ня буду?

Пэўне-ж, што бяз патрыятызму жыць будзеш і не памрэш, прынамся ня ўся, але частка цябе памрэ напэўна! Памрэ тая частка, што прыпадабняе цябе да людзей прыгажэйшых і вышэйшых духам, тая частка, што набліжае цябе да Еўфрасіньні Полоацкай. Памрэ тая частка, пра якую паэта Алесь Звонак аб беларускіх жанчынах кажа:

Гордасьць пэўна, ўзялі вы ў Рагвалодавай Рагнеды,
Дум яснасць, Еўфрасіньня, пэўна, ў спадчыну дала.
Кроў сваволных крывічанак бунтавала вас у бедах –
Пакідалі вы сьвятліцы, бралі ў рукі вы булат.

Раіса Жук-Грышкевіч.



Яны не хочуць быць манкрутамі...

Конкурс "Не пакідайце ж мовы нашай беларускай", які праводзіла Таварыства беларускай школы, паказаў, што дзеці не баяцца вучыцца на беларускай мове. Пра гэта сведчаць цытаты з конкурсных работ. "Чатыры гады я вучыўся на беларускай мове. Потым у СШ № 153 г. Менска родную мову вырашылі вынішчыць. Усе класы разам, у адзін час, перавялі на мову суседняй дзяржавы. Я звяртаўся да дырэктара школы, да настаўнікаў, якія сталі на бок знішчэння маёй любімай мовы., каб яны адумаліся, пакаяліся, не рабілі вучняў манкрутамі. Але ўсё дарэмна. Мне давялося перайсці ў СШ № 2, — піша Палюховіч Ігар у сваім сачыненні "Вывучайце роднае слова".

Вучань сярэдняй школы № 33 г.Віцебска Каржыцкі Максім, які стаў лаўрэатам конкурсу, так і назваў сваю работу – "Я – не манкрут".

А вось што напісаў Аляксандр Новікаў з Гарадка Віцебскай вобласці: "Здаецца, зусім нядаўна слова беларускае трывала ўваходзіла ў паўсядзённае жыццё беларусаў. На жаль, не ўсіх. Шмат людзей не прызнае беларускую мову, не лічыць сваёй роднай". Хлопчык шмат займаецца беларускай мовай самастойна: "... беларускую мову я зараз ведаю, калі не лепш, то і не горш за маіх аднагодкаў, якія ў пачатковай школе вучыліся ў беларускамоўных класах".

Бабіч Юлю, шасцікласніцу СШ № 4 г.Жодзіна, хвалюе, што хутка на Беларусі ўсе школы будуць на рускай мове. "Я гэтага не хачу, бо прывыкла вучыцца па-беларуску. І таму я звяртаюся да настаўнікаў, да дырэктараў школ, да самога міністра! У нашай школе ніводнага беларускага класа не перавялі на рускую мову. У нас шануюць і паважаюць родную мову ўсе, пачынаючы з вучняў і канчаючы дырэктарам школы. А ў вас?"

А ў нас, у сталічнай школе № 180, зусім іншыя адносіны да ўсяго беларускага. Мая вучаніца, дзевяцікласніца Насця Саланевіч, у сваім сачыненні "Беларуская мова ў маім жыцці" успамінае: "Я пачынала вучыцца ў беларускамоўным класе і вельмі хацела застацца ў ім па-сёння. Але лёс распарадзіўся інакш. Шкада, што ў нашай школе няма англійскага класа на беларускай мове, я б там вучылася".

А было гэта так. У той час, калі Насця пачынала вучыцца, у СШ № 180 г. Менска былі адкрыты тры першыя класы з беларускай мовай навучання. Праз чатыры гады з гэтых трох беларускамоўных класаў зрабілі – два, бо трэба, каб у кожным класе было не меней 25 вучняў. Пасля заканчэння сёмага класа пачалі стварацца профільныя і спецкласы: матэматычны, хіміка-біялагічны, англійскі, фізкультурны. Вядома ж, усе – рускамоўныя. У гэтыя класы перайшло аж 30 вучняў. У выніку з тых трох беларускіх класаў сёння застаўся толькі адзін – 9 "Д". Дырэктар школы Меяроўскі В.С. не супраць, каб школьнікі працягвалі навучанне ў дзесятым класе на роднай мове, але яго хвалюе недастатковая напаўняльнасць класа: усяго 21 чалавек пры норме – 25. Нядаўна ў нас была праверка КРУ, у выніку якой адміністрацыі школы трэба вярнуць дзяржаве 4 мільёны рублёў, таму што ў 6 "Д" класе з беларускай мовай навучання ўсяго 14 вучняў. Значыць, лічыць КРУ, аплату за сваю працу класны кіраўнік павінна атрымліваць палавінную, нягледзячы на тое, што праводзіць не палову класнай гадзіны, а цэлую, не палову экскурсіі, а цэлую.

Завуч Еўтухоўская С.А. называе іншую прычыну, чаму не будзе сфармаваны дзесяты беларускамоўны клас: "Няма кадраў".

Андрэй Дэц, які дзевяць гадоў вучыўся ў класах з беларускай мовай навучання, у сваім сачыненні "Праблема, вартая ўвагі" піша: "Улады не рыхтуюць настаўнікаў выкладаць свой прадмет на беларускай мове, часам выкладчыкі адмаўляюцца весці ўрокі на роднай мове. А яшчэ бывае і такое: у школе ёсць настаўнікі, якія валодаюць беларускай мовай, але іх наўмысна накіроўваюць працаваць у класы з рускай мовай навучання".

Ствараецца ўражанне, што адміністрацыя СШ № 180 імкнецца любымі сродкамі пазбавіцца беларускамоўных класаў. Таму некаторыя бацькі напісалі заявы на перавод сваіх дзяцей у класы з рускай мовай навучання. Яны баяцца, што ў беларускамоўных класах будуць выкладаць кепскія настаўнікі, а па заканчэнні школы выпускнікі не змогуць атрымаць вышэйшую адукацыю на роднай мове.

Пералічаныя факты сведчаць пра абыякавасць кіруючых органаў да праблем беларускамоўных школ і класаў. Таму гэтыя праблемы як былі, так і застаюцца надзённымі.

Алена Дэц, настаўніца СШ № 180 г. Менска.

...і яны не хочуць

Ніколі не пісала вам раней, так ужо неяк сталася, але цяпер адважылася, бо больш не стае сілы маўчаць, каб вы ведалі, што і ў Калінкавічах таксама ёсць прыхільнікі – абаронцы Бацькаўшчыны, мовы.

Прыдаў моцы артыкул Міхаліны Ваўчок "Надзея на сям'ю" ("Наша слова" за 24.02.99г.). Імгненна прачытаўшы яго, потым перачытвала яшчэ раз, абдумваючы кожны радок. Назаўтра дала магчымасць пазнаёміцца з ім сваім дзесяці і адзінаццацікласнікам. Узяцца за ліст прымусілі і іх водгукі.

Вось некаторыя з іх:

"Я ніколі раней (і гэта вельмі дрэнна) не задумваўся над тым, хто я такі. А праслухаўшы артыкул М.Ваўчок – задумаўся... Перш за ўсё насцярожыла тое, чаму мы, сапраўды, не размаўляем на роднай мове. Ці ж яна горшая за англійскую, нямецкую, украінскую, малдаўскую? Ды не ж, па мілагучнасці гучання мы другія ў свеце (так казала нам Тамара Аляксандраўна). Дык што ж з намі робіцца?

Андрэй.

"Я вельмі хачу, каб у XXI стагоддзі ўсе беларусы нарэшце загаварылі толькі на сваёй роднай мове. А гэта ўсё ў нашых уласных руках".

Віталь.

" Я падтрымліваю аўтара ў тым, што будучае залежыць ад сям'і. Каб беларусы не вымерлі, як наця., патрэбна тэрмінова (яшчэ не позна!) пачаць працу ў сям'і..."

Сяргей.

"Я б так хацела, каб усе мае аднакласнікі размаўлялі на роднай мове, каб з іх не смяяліся ні ў аўтобусе, ні на вуліцы, ні ў кінатэатры. На жаль, толькі кпіны... Ды і дома маці з бацькам размаўляюць на трасянцы, а ў перапісным лісце напісалі, што яны дома размаўляюць на рускай мове....

Таму я хачу, каб артыкул Міхаліны Ваўчок з Баранавіч прачыталі ўсе, у першую чаргу мае бацькі..."

Святлана.

"Як добра, што ёсць на свеце "Наша слова", што ёсць наша настаўніца, якая "падкідвае" нам такія артыкулы. Можа, і паразумнеем? Уся надзея – на сям'ю і школу..."

Ірына.

"Я думаю, што ўсё ж надыдзе час, калі наш народ прачнецца. Каб мае аднагодкі з іншых школ прачыталі артыкул М.Ваўчок, яны б зразумелі... Я летась была ў Італіі... Як прыгожа там усе размаўляюць на сваёй мове... Мне было сорамна, што я не ўмею, на жаль...".

Наталля.

" Я ўжо ўяўляю, як мы разам (мая будучая дачка, муж і я) едзем у Жыровіцкі манастыр, а затым – на радзіму Сапраўднага Беларуса Уладзіміра Караткевіча, а мая маленькая Рагнедка (я назаву яе толькі так!) пытаецца і пытаецца: то пра бабулю, то пра дзядулю, то пра сваё імя..."

Тацяна.

"Ну, чаму не вучылі нас гэтаму раней? Чаму смяюцца мае аднагодкі з роднай мовы? Чаму мы такія? Добра, што настаўніца прачытала нам гэты артыкул. Няхай цяпер кожны падумае...".

Аляксандр.

Для мяне галоўным было тое, як адрэагуюць мае старшакласнікі на парады карэспандэнткі. Я вельмі спадзявалася, што яны (мае дарослыя дзеці, якім праз некалькі месяцаў выходзіць у самастойнае жыццё) падтрымліваюць кожны пункт, паселяць кожны радок у сваё сэрца, прапусцяць яго праз сваю юначую душу, адчуюць боль і спадзяванні, надзею і веру...

І дзякуй Богу, я не памылілася, у многіх сваіх вучняў не памылілася. Безумоўна, былі і такія радкі, што маўляў, не галоўнае гэта... Але ж большасць вучняў закрануў тэкст-парады. Я ўдзячна сваім выхаванцам, што большасць з іх адной са мною думкі, што і ў іх шчымiць сэрца...

А што многія задумаліся над радкамі газетнага артыкула гаворыць і той факт, што на маю прапанову ахвяраваць грошы на падтрымку ТБМ і газеты "Наша слова", амаль усе згадзіліся. Ужо сабрана больш 300 тысяч, але аперацыя "Не пакідайце ж мовы беларускай працягваецца ў нашай школе. Значыць, неабыякавыя яны да лёсу краіны, да лёсу роднай мовы. Значыць, ёсць надзея... на іх будучыя сем'і. Значыць, будуць яны спяваць беларускія песні, глядзець з дзецьмі "Калыханку", распавядаць ім пра Льва Сапегу, Кірылу Тураўскага, Еўфрасінню Полацкую. Значыць, паедуць яны ў святыя мясціны Беларусі – Полацк, Навагрудак, Нясвіж...

Верма ў гэта, дзецюкі!!

З павагаю да вас, настаўніца беларускай мовы Акулевіч Тамара Аляксандраўна.

Адмысловы слоўнік фізічнай тэрміналогіі

Нядаўна ў выдавецтве Гарадзенскага ўніверсітэта імя Янкі Купалы выйшаў з друку "Руска-беларускі фізічны слоўнік" (Гродна: ГрДУ, 199.-498с.), падрыхтаваны на пачатку1994 года навукоўцамі універсітэта А.М. Каладзінскім, Д.М. Карацінскай і П.У.Сцяцко. Досыць выразнае ўяўленне пра слоўнік чытач можа атрымаць з прадмовы слоўніка. Звернемся да яе

Пасля абвяшчэння незалежнасці нашай краіны – Рэспублікі Беларусь разгарнуліся шырокія магчымасці для нацыянальна-культурнага адраджэння, для натуральнага развіця беларускай мовы. Прыняцце Закона аб мовах, у якім беларускай мове нададзены статус дзяржаўнай у Рэспубліцы Беларусь, вымагае актыўнага функцыянавання роднай мовы ва ўсіх сферах грамадска-культурнага жыцця. Перадусім такою сфераю выступае адукацыя, бо менавіта тут, у сярэдняй школе і ВНУ, закладваецца той грунт, тая глеба, на якой вырастае нацыянальная свядомасць, нацыянальная культура. Перашкожаю на шляху беларускамоўнага навучання з'яўляецца недастатковая распрацаванасць і ўкараненне ў практыку навуковай нацыянальнай тэрміналогіі. Навуковая тэрміналогія, як вядома, у пэўнай ступені адлюстроўваецца ў акдэмічных слоўніках беларускай мовы. Беларускія слоўнікі, асабліва ў 60-80-я гады, запаланілі беспадстаўныя пазычанні і калькі з рускай мовы, сярод якіх – шматлікія штучныя структуры, неўласцівыя беларускай мове.

У 1977 годзе народны паэт Беларусі, акадэмік Максім Танк занатаваў: "Ўзяўся гартаць слоўнікі. Бясконцая і бяздумная запазычанасць чужых слоў, як у нас, не можа не пагражаць дэградацыяй самой мове". Пазней, у 1993 годзе, пад час адраджэння нашай культуры і мовы ў сувярэннай краіне Максім Танк запісаў: "Зараз наша мова, якая доўгі час была і ў загоне, і ў прыгоне, патрабуе грунтоўнай рэстаўрацыі і ачышчэння ад розных непатрэбных запазычанасцяў" (Полымя. 1997. № 12. – С.69). Пры складанні слоўніка аўтары імкнуліся адысці ад бяздумнага калькавання і пазычання з рускамоўнай фізічнай тэрміналогіі, разумеючы, што аднабокавая арыентацыя на чужую мову перашкаджае развіццю роднай мовы. Таму ў падачы беларускіх тэрмінаў арыентаваліся на прыярытэтнае выкарыстанне сродкаў роднай мовы, на строгае захаванне ўласцівых нашай нацыянальнай мове заканамернасцяў на ўсіх яе ўзроўнях – лексічна-семантычным, фаналагічным, марфемна-словаўтваральным і граматычным. Слоўнік мае каля 20000 тэрмінаў у кожнай з частак. Пры пердачы рускага тэрміну некалькімі беларускімі эквівалентамі на першае месца выносіцца традыцыйны тэрмін або той, якому аддаецца перавага: пры гэтым аўтары палічылі мэтазгодным адлюстраваць у матэрыялах слоўніка розныя сінанімічныя варыянты беларускіх тэрмінаў, тым самым даючы чытачу, карыстальніку слоўніка мажлівасць выбару таго з варыянтаў, які на яго думку, можна лічыць найбольш прыдатным, адпаведным законам нацыянальнай беларускай мовы. У слоўнікук знайшла сваё адлюстраванне пэўная частка астранамічных, матэматiычных, тэхнічных і хімічных тэрмінаў, а таксама слоў і словазлучэнняў, якія не з'яўляюцца фізічнымі тэрмінамі ў строгім сэнсе слова, але рэгулярна выкарыстоўваюцца ў навучальных дапаможніках, падручніках, лекцыйных тэкстах для характарыстыкі фізічных рэаліяў і паняццяў.

Адпаведнасць беларускага эквівалента вызначэнню пэўнага фізічнага паняцця і рэаліі ўстанаўлялася на падставе дакладнага высвятлення іх сутнсці. Гэтую надзвычай адказную працу выканаў навуковец-фізік, кандыдат фізічна-матэматычных навук, дацэнт А.М. Каладзінскі. Лінгвістычную нарматыўнасць беларускіх эквівалента забяспечылі два астатнія аўтары: доктар філалагічных навук, прафесар, член Рэспубліканскай тэрміналагічнай камісіі пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь, старшыня яе Гарадзенскае філіі П.У.Сцяцко і кандыдат філалагічных навук, дацэнт Д.М.Карацінская. Яна ж выконвала і самую вялікую працу па ўкладанні слоўніка. Пры падрыхтоўцы слоўніка выкарыстоўваліся навукова-тэхнічныя перыядычныя выданні, манаграфіі, навучальныя дапаможнікі і падручнікі па фізіцы для ВНУ і сярэдняй школы, энцыклапедыі (у тым ліку і 5-томавая "фізічная энцыклапедыя"), тэрміналагічныя даведнікі 20-30 гадоў, акадэмічныя слоўнікі і сучасныя спецыяльныя галіновыя даведнікі, а таксама шматлікія артыкулы па тэрміналогіі і культуры мовы.

На завяршальным этапе працы над "Руска-беларускім фізічным слоўнікам" аўтары мелі магчымасць пазнаёміцца з выдадзенымі ў 1993-1995 гадах і пазней тэрміналагічнымі даведнікамі па фізіцы, матэматыцы ды іншых галінах ведаў і пераканацца ў правільнасці абранай канцэпцыі на прыярытэтнае выкарыстанне сродкаў роднай мовы пры вызначэнні беларускіх адпаведнікаў да рускамоўных тэрмінаў. Слоўнік рэцэнзавалі вядомыя на Беларусі навукоўцы: доктар філалагічных навук, прафесар, член Рэспубліканскае тэрміналагічнае камісіі пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь, загадчыца кафедры беларускай мовы і беларусазнаўства Акадэміі кіравання Рэспублікі Беларусь Л.А.Антанюк, доктар фізічна-матэматычных навук, прафесар С.А.Маскевіч і кандыдат фізічна-матэматычных навук, дацэнт Г.А.Гачко.

Аўтары з удзячнасцю прымуць карысныя заўвагі і прапановы, накіраваныя на ўдасканаленне беларускай навукова-практычнай тэрміналогіі. Бо толькі супольнымі намаганнямі можна выпрацаваць і ўдасканаліць нацыянальную беларускую тэрміналогію, адрадзіць і развіць нашую духоўнасць, нацыянальную культуру і мову. Гэтаму спрыяе і падрыхтоўка ў розных калектывах навукоўцаў спецыяльных даведнікаў па той самай галіне ведаў.

НЕ ПОЛЕ ПЕРАЙСЦІ

Дакументальны аповед Рыгора Шавуры

Да самадзейнага мастака

Шлях быў не блізкі і таму, здаецца, усё перагаварылі за дарогу, нейкі час ехалі моўчкі. Пейзажы змяняліся адзін за другім. Перад вачыма распасціраліся бязмежныя прасторы асушаных меліярацыяй палёў, дзе ніводнага кусціка, дрэўца, толькі роўныя, як шнур канавы з простымі канструкцыямі дамб, якія даўно заржавелі, паколькі ніколі, напэўна, не апрабоўваліся ў сваёй практычнай дзейнасці. Незвычайна глядзець на вось такія, штучна навязаныя прыродзе краявіды, дзе ўсё зруйнавана, як кажуць, пад грэбень. Быццам вялізная аэрадромная пляцоўка з тонкай віхлястай асфальтаванай дарогай праплывае за вокнамі нашага аўтамабіля. І вось ён праязджае праз лясны масіў, які доўга цягнуўся да самага канечнага нашага пункта кіравання. Паабапал дарогі высокія, роўныя, быццам карабельныя сосны, цёмнасінія густыя елкі, хмызнякі. Стала зусім цёмна, да таго ж час ужо быў вячэрні. У Скароднае, гэта цэнтральная сядзіба саўгаса "Скараднянскі", мы прыехалі з запаленымі фарамі. Засталося яшчэ 5-6 кіламетраў па палявой дарозе, той памятнай дарозе, па якой пасля доўгіх багатых кастрычніцкіх дажджоў можна праехаць бадай што толькі на гусенічным трактары. Але ж і пешшу па такой дарозе ісці толькі ў гумовых ботах.

Дожджык не пераставаў накрапваць. Прамільгнулі за вокнамі кантора саўгаса, жылыя будынкі вёскі і нашу машыну так стала кідаць у бакі, што ўтрымацца ў крэсле было вельмі і вельмі цяжка. Глыбокія каляіны, выразаныя нашымі славутымі "Беларусамі", былі да верху запоўненыя вадой. Цяжка было адгадаць, правалімся да самага капота, ці выскачым на больш сухое месца. Здавалася, што далей рухацца немагчыма, але ж да "Мядзведнага", што б там не стала, патрэбна дабрацца, як мага хутчэй. Алена Іосіфаўна Красічкава – старшы метдыст Межсаюзнага Дома самадзейнай творчасці – не здарма ўсхвалявана. Сцямнела, дождж узмацніўся. Куляючыся, дзе з разгону, дзе ў аб'езд праехалі мы шмат. Наперадзе святло фар высвечвала контуры вёскі. Усе ўздыхнулі з аблягчэннем – дабраліся, дзякуй Богу. Уазік загрымеў яшчэ мацней, разагнаўся, каб пераадолець вадзяную перашкоду, ускочыў на самую сярэдзіну, уздрыгнуўся, захрыпеў і заціх. Спробы завесці машыну не ўвянчаліся поспехам. Што рабіць? Нас у кабіне разам з шафёрам пяць чалавек. Трэба вылазіць. А куды? Да сухога месца метры чатыры. Пачалі прыкідваць, як выйсці з такога становішча. Усё ўзважылі, а выхад адзін – здымаць абутак і ў брод. З жартам і крыкам сталі высоўвацца з цёплых месц нашага "лімузіна" ў халодную, як лёд, брудную калюжыну. Маладзейшыя з нас непрыкметна выскачылі на сухое месца і сталі дапамагаць Алене Іосіфаўне. Знайшлі некалькі алешын, падмасцілі, — можна перапраўляцца. Усё было б добра, каб не разышоўся гэты драўляны насціл. Красічкава зрабіла толькі два крокі і звалілася ў сваіх шкарпэтках у вязкую брудную жыжу. Прыйшлося затраціць некалькі хвілін, каб навобмацк адшукаць абутак, прывесці яго ў належны стан. Смяяліся, жартавалі, не паказвалі таго, што замачыліся і азяблі.

Шафёр застаўся ля машыны, а мы "гуськом" пацягнуліся да вёскі. Між іншым дарога стала амаль сухой, жвіровай. У першых вяскоўцаў, што сустэліся на шляху, запыталіся: "Дзе жыве брыгадзір саўгаса?" Нам паказалі хату і мы гуртом падаліся ў двор. Было цёмна. Святло ад вокан худа-бедна асвятляла дарогу, ды і на павароце, метраў за дзвесце, гарэў на слупе ліхтар. Света, метадыст Рэспубліканскага Межсаюзнага Дома самадзейнай творчасці і Алена Іосіфаўна зайшлі ў хату брыгадзіра. Гаспадар як раз быў дома, жонка ладзіла вячэру. Некалькі хвілін прыйшлося растлумачваць хто мы такія, чаго прыехалі і што нам патрэбна. Калі, нарэшце нас зразумелі, у чым справа, адразу неяк зарухаліся, занепакоіліся, актывізавалася гаворка:

-Дык, як жа не ведаць, - адказаў брыгадзір. У вёсцы ўсе адзін аднаго, як кажуць, наскрозь ведаюць. Міхась Засінец ... — неяк расцягнута прагаварыў ён. – Так, так... Пеця, — звярнуўся ён да свайго сына. – Бяжы да маці Міхася. Няхай прыдзе ды правядзе нашых гасцей, а я падыйду на мехдвор па трактар. Прысядзьце на хвілінку, зараз усё арганізуем.

Нам неяк няёмка было заставацца ў хаце, паколькі двое нашых чакаюць на вуліцы, але і адмаўляцца было непрыгожа. Селі. Пачалі весці гаворку пра надвор'е, дарогу, пра выпадак з машынай. Алена Іосіфаўна доўга скардзілася на дождж, на мокрыя шкарпэткі, якія яшчэ чвакалі на нагах пры малейшым руху. Так і непрыкмецілі, як у хату ўвайшла маці Міхася Засінца. Завязаная ў шэрую хустку і гумовых ботах, яна трымала ў руцэ два прадаўгаватых паленцы. Прывіталася. Мы прадставіліся і ўжо сумесна з гаспадыняй хаты ў агульных словах паведалі мэту нашага візіту. Жанчына ківала галавой, потым неяк, быццам саромеючыся, ціха заплакала прычытаючы:

—Людцы мае добрыя... Да майго сыночка. Дзякуй вам, ён будзе вельмі рады. Пойдзем жа. Тут усе загаманілі, выйшлі ў двор, паклікалі астатніх двух, што чакалі на вуліцы. Сталі разважаць, як найлепей дайсці, бо дарога да хаты Засінца, як стала вядома, была не лепей за тую, што нам даводзілася пераадольваць на машыне. Маці Засінца падказала, што трэба ісці ў абход па сцяжынцы паміж агародаў, сушэй будзе. Яна дастала з кішэні запалкі і не без цяжкасцяў падпаліла два смалякі. Разгарэўшыся, яны асвятлілі наваколле яркім жоўтым святлом і мы зноў "гуськом" падаліся ў дарогу. Маці Засінца з паднятымі над галавою пылаючымі "паходнямі" нагадвала горкаўскага Дантэ. На шляху прыходзілася пераадольваць розныя перашкоды – абыходзіць калюгі, пералазіць праз плот, трымаючыся за жэрдкі ступаць па вузкай палосцы сцяжынкі. Раптам наша праваднiца спынілася і сказала:

—Трэба адзін смаляк патушыць, а то на зваротны шлях не хопіць.

І патушыла. Ззаду цяпер давялося ісці амаль упоцемак і кіраваць напрамкам усёй грамады.

З няменшымі цяжкасцямі і не без прыгод дабраліся ў двор Міхася Засінца. Нейкі час тупаліся ля ганку, абмяталі ногі галлём. Першай у хату ўвайшла Алена Іосіфаўна і мы за ёй. У пярэдняй нас сустрэла жонка Міхася – Надзея. Прывіталіся. Распрануўшыся, уся наша ватага падалася ў залу. На ложку на высокай падушцы ляжаў Міхась Засінец. Усе мы паздароўкаліся за руку і Алена Іосіфаўна, як быццам за ўсіх нас, сказала:

—Напэўна Міхась Мікалаевіч нас не чакаў, а мы вось нарэшце дабраліся.

—Шчыра кажучы – не чакаў, менавіта сёння. Надвор'е дрэннае, ды і дарога да бальшака, гавораць, кепская.

—Вось вёска дзе размясцілася: Сама назва "Мядзведнае" за сябе гаворыць, ні дайсці, ні дабрацца, — усміхаючыся, мяккім голасам дадала Красічкава.

—Не ... не праўда. Вёска наша прыгожая. У вясну, ці летам. Тут такія цікавыя краявіды. Рэчка, луг – усё ў кветках. А як лес сасновы пахне пасля дажджу! – адказаў наш субяседнік.

Міхась з радаснай усмешкай акінуў нас поглядам. Наступіла на нейкую долю хвіліны цішыня. Мы нават разгубіліся. Цяжка было тут жа зарыентавацца аб чым далей весці гаворку. Перад намі ляжаў чалавек, вось ужо больш дзесяці год прыкаваны да ложка. Кожны з нас ведаў яго трагічны лёс і таму гаварыць аб настроі, ці нават аб жыцці Засінца было б, як кажуць, не да месца, усё ж і так зразумела.

Пасля таго, як мы ўладкаваліся ў хаце з цёпла напаленай печкай, кожны з нас вёў гамонку пра культурныя падзеі ў Менску, пра кнігі, аб мастацтве і мастаках. Нейкім часам спрачаліся аб творчасці таго ці іншага жывапісца, графіка, выказвалі свае супярэчлівыя адносіны да розных напрамкаў у мастацтве і асабліва да сучаснага авангардызму. Засінцу падабалася такая размова. Па сутнасці яму даводзілася бадай што ўпершыню ўдзельнічаць у такой вось ажыўленай размове аб мастацтве ў коле мастацтвазнаўцаў, метадыстаў, практыкаў у рабоце народнай і самадзейнай выяўленчай творчасці. Яго твар напоўніўся натхнёнасцю, у вачах усё мацней і мацней загаралася іскарка жыццерадаснасці і надзеі, той надзеі, якая давала шанец жыць далей, жыць недарэмна.

Міхась Міхайлавіч, — звярнулася Алена Іосіфаўна. – А мы не проста прыехалі наведаць вас. Яшчэ нешта і прывезлі.

Красічкава падалася да дзвярэй, дзе размяшчаўся наш "багаж" і стала яго распакоўваць. Тут на падмогу падышла Света і разам пачалі разгортваць з паперы мастацкія матэрыялы і прыналежнасці. Нейкі дзясятак розных памераў пэндзеляў, фарбы ў цюбіках, грунтаванае палатно, эцюднік, кардон, папера для малюнкаў. Алена Іосіфаўна звязак пэндзляў перадала ў рукі Засінца. Міхась пэўную хвіліну разглядваў сапраўдныя мастацкія пэндзлі, дакрануўся рукой да ворсу, правадзіў ім па твару. Вельмі падабалася. На яго вачах пакаціліся слёзы.

—Якое багаце! Ці ж я калі-небудзь бачыў ўсё гэта? Даражэнькія мае, вялікае дзякуй вам. Калі б я мог падняцца, я пакланіўсяб вам у ногі. Якое багацце, мне ніколі не снілася ўсё гэта, дзякую.

Мы ўсе разгубіліся. Не чакалі такой рэакцыі на гэты, здавалася б, даволі сціплы падарунак. Ну што тут асаблівага – самыя элементарна патрэбныя рэчы для мастака, для яго творчасці. Але мастак ацаніў па-свойму значнасць усяго таго, што так патрэбна і дорага яму зараз у жыцці нялёгкім, складаным. Менавіта творчасць, любоў да мастацтва заставаліся адзіным звяном у трагічным лёсе гэтага чалавека, якія звязвалі яго са знешнім светам, навакольным асяроддзем, сучаснасцю і мінулым. Дагэтуль Міхась Засінец маляваў зусім кепскімі пэндзлямі, больш прыгоднымі для клею, ці зробленымі самім са старога кажуха. А тут сапраўдныя – круглыя, плоскія, з мяккага ворсу і шчацінныя. А фарбы – мастацкія, усялякія і, як здавалася, іх было шмат.

—Сёння ў мяне сапраўднае свята, — як бы да ўсіх звярнуўся ён. Вось усяго гэтага я сапраўды не чакаў.

Кожны з нас адчуваў нейкую унутраную задаволенасць нават за тое, што мы дабраліся гэтым даволі складаным "транспартам" шляхам недарэмна. Наш візіт стаўся добрым настроем для чалавека, які жорстка і безнадзейна пакутваў ад фізічнай немачы. Што можа быць страшней у чалавечым жыцці, чым нерухомасць ды і яшчэ ў маладым узросце. Вось гэта можа зусім кароткая хвіліна нашай сувязі з самадзейным мастаком зноў вярнула яго да радасці, да веры ў прыгожае, у чалавечую дабрыню і міласэрнасць натхніла на аптымізм і сілу да далейшага жыцця карыснага для людзей, грамадства.

Алена Іосіфаўна ўся без астатку свяцілася радаснай усмешкай. Менавіта яна ўсё зрабіла для таго, каб падтрымаць гэтага чалавека ў час яго нялёгкіх жыццёвых выпрабаванняў.

Усе мы гутарылі па шматлікіх праблемах мастацтва, палітыкі, жыцця сённяшняй вёскі. Гаспадыня хаты разам са свякроўю прыгатавалі вячэру. Пах смажанага сала, яешні ўжо адчуваўся і тут, дзе мы гуртом сядзелі ў святліцы. Неўзабаве Надзея, жонка Засінца, як быццам саромеючыся, паклікала да стала. Мы перайшлі ў трысцен і, робячы выгляд што яшчэ не прагаладаліся, усё ж не сцярпелі і накінуліся на ежу з натуральных сялянскіх прадуктаў. Неяк няёмка адчувалі сябе, Міхась застаўся ў тым пакоі, а мы вячэраем без яго. Але Надзея нас супакойвала, маўляў, нічога, усё добра, не звяртайце ўвагі, мы ўжо прывыклі. Ад гэтых слоў стала яшчэ цяжэй на душы. Кожны з нас разумеў лёс гэтага чалавека, яго фізічныя пакуты, бездапаможнасць і адчай перад ужо шматгадовай нерухомасцю. І бадай што больш за ўсіх прымала да сэрца Алена Іосіфаўна. Толькі яна і ніхто іншы адкрыла для шырокага грамадства Міхася Засінца як нарэдкасць самабытнага таленавітага самадзейнага мастака. Менавіта яна ўбачыла ў ім першыя нясмелыя расткі мастацкага таленту, звярнула на гэта ўвагу і ўсімі сродкамі садзейнічала ўдасканальванню яго прыроднага дару, фарміраванню творчых здольнасцей і грамадзянскіх пазіцый. І важным у гэтым з'явілася вяртанне здавалася б асуджанага на самае страшнае ў жыцці чалавека да аптымістычнага настрою, гранічна магчыма чалавечага існавання. Неабходна было ўсяліць трапіўшаму ў бяду веру ў жыццё, у свае духоўныя сілы. І тут дапамагло мастацтва, якое з гадамі ўсё мацней і мацней захоплівала яго духоўны свет, падавала сілы для барацьбы з хваробай.

Вячэра працягвалася нядоўга. Усе хутка падмацаваліся, выпілі па ёмістым кубку свежага малака і, падзякаваўшы, адышлі ад стала. Час быў позні. Сталі радзіцца, што далей рабіць. Гаспадары настойліва прасілі застацца пераначаваць. Спачатку так і парашылі. Але частка нашых пасажыраў чамусці занекалася і стала прапаноўваць, каб ехаць у Гомель, а там, паспець на цягнік. Урэшце пагадзіліся з тым, што трэба адпраўляцца.

Некалькі хвілін яшчэ пагутарылі з Міхасём, стараліся падбадзёрыць яго. Алена Іосіфаўна азадачыла мастака новымі тэмамі, сюжэтамі да маючай адбыцца выстаўкі ў рамках другога ўсесаюзнага фестывалю самадзейнай творчасці, параіла што ўзяць за аснову для серыі жывапісных палотнаў. Хутка апрануліся і, яшчэ раз падзякаваўшы за гасціннасць, сталі развітвацца. Шафёр прыспешваў усіх, да цягніка можам не паспець, наперадзе трэба праехаць каля дзвухсот кіламетраў. У двары Маці Засінца запаліла смаляк і ўсе мы падаліся па ўжо вядомаму шляху між агародаў і сялянскіх пабудоў да машыны.

На адваротным шляху даводзілася не раз выходзіць з машыны, выпіхваць яе на цвёрдае і сухое месца, зноў садзіцца і ехаць далей. Некаторыя выказвалі незадаволенасць за ўсе гэтыя дарожныя пакуты, сварыліся на надвор'е, дарогу, даставалася і Алене Іосіфаўне за яе настойлівасць у ажыццяўленні паездкі да Міхася Засінца. Красічкава старалася маўчаць, але час ад часу ціха і спакойна паўтарала:

—Дрэнна,цяжка, дарога вядома якая. Але не паехаць да Засінца было нельга. Даўно чалавек нас чакаў, ці можна было адкладваць далей гэта мерапрыемства?

Усе замаўкалі. Ведалі, што нашы дарожныя нягоды нічога не варты перад тым трагічным лёсам чалавека, якому мы і ішлі на дапамогу.

Калі ўазік выскачыў на асфальтаваны бальшак, усе прыгоды адразу і скончыліся. У вузкай палосцы святла фар мільгалі на ўзбочыне гладкастволыя сосны, час ад часу праязджалі па вёсках, пасёлках і так да Калінкавіч. Да цягніка паспелі і, як кажуць,у прыцірку. У вагоне сталі ўладкоўвацца. І толькі цяпер прыкмецілі, што наш абутак і адзенне ў такім становішчы, што паказвацца на людзях было нельга ні ў якім разе. Але ж мы ўжо ў вагоне. Давялося доўга чысціцца ад бруду, прыводзіць сябе да божыскага выгляду. Цягнік ужо роўнамерна адстукваў па рэльсах сваю мелодыю. Усе з нас адмовіліся ад чаю, уладкоўвалі свае лежакі. За дзень змарыліся, хацелася адпачыць.

(Працяг у наст. нум.)

Беларускае слова: Самсон Пярловіч

Гартаю бібліяграфічны слоўнік "Беларускія пісьменнікі" і, на жаль, не знаходжу ў ім многіх слаўных іменаў, якія па праву належаць беларускай літаратуры.

Цяжка зразумець, чаму ў шасці тоўстых тамах не знайшлося месца для сусветнага класіка, літаратурнага генія з Наваградчыны – Адама Міцкевіча, творы якога літаральна прасякнуты беларускім каларытам, беларускай даўнінай, беларускай моўнай стыхіяй (нагадаем, што Адам Міцкевіч пісаў па польскай мове беларускай рэдакцыі). І тым болей недарэчная адсутнасць імя Адама Міцкевіча ў бібліяграфічным слоўніку "Беларускія пісьменнікі", што ў ім – гэтым слоўніку – падаюцца падрабязныя бібліяграфіі цэлага шэрагу вядомых і малавядормых пісьменнікаў, якія пісалі па-царкоўнаславянску, па-лацінску, па-польску, па-расейску, па-габрэйску, па-летувіску…

Але Адам Міцкевіч – не адзіны Паэт з Наваградчыны, абыйдзены ўвагай у выданні "Беларускія пісьменнікі".

Не згаданы ў слоўніку і наш сучаснік, адметны, вартасны Паэт – Самсон Пярловіч – Беларус, які за свой талент, спалучаны з сумленнем і годнасцю, прайшоў праз пекла сталінізму…

Вось як піша пра свой творчы і жыццёвы лёс сам Паэт: "Нарадзіўся 13 жніўня 1923 года ў вёсцы Католышы, непадалёку ад Наваградка. Пасля Наваградскай сярэдняй школы вучыўся ў Наваградскім педвучылішчы, дзе і застала вайна. У ваенныя гады спярша настаўнічаў у вясковай школе. 20 жніўня 1943 году быў вывезены на работу нямецкімі акупантамі ў латышскі порт Лібава, затым, пасля ўцёку – аж у аўстрыйскую Вену. Ужо тады пісаў вершы. І вярнуўшыся ў Наваградак восенню 1945 году, пачаў працаваць літаратурным работнікам у раённай рэдакцыі газеты "Звязда". Незадоўга быў падвергнуты ціску з боку МДБ. Вось тады мой былы аднакласнік (а гэта быў мужны патрыёт – Генадзь Казак – арганізатар "Саюзу вызвалення Беларусі") аднойчы пры сустрэчы мне сказаў, што ўсе, хто пабываў пад акупацыяй, раней ці пазней будуць пакараныя. Я сабе тады падумаў, то сапраўды так і адбываецца… Да "Саюзу вызвалення Беларусі" далучыўся і я. Вясной таго 1947 году (31 траўня) па даносе падасланага правакатара ўсіх нас – васемнаццаць сяброў "Саюзу вызвалення Беларусі" раптоўна арыштавалі, а 30-31 жніўня, пасля цяжкіх допытаў, засудзіў ваенны трыбунал"…

Дваццацічатырохгадовы юнак тады быў асуджаны фактычна за свой верш "Паднімецца крыўда", у якім выкрывалася нечалавечая сутнасць сталінізму. Сам Цанава – крывавы кат на нашай беларускай зямлі – раз'юшана яхкаў на юнака за гэты верш… Сведчанне пра тую вымушаную сустрэчу з Цанавам Самсон Пярловіч пакінуў у іншым сваім вершы – "Аб сустрэчы крывавай з эмдэбістам Цанавам". Абодва вершы з'яўляюцца не проста мастацкімі палотнамі свайго часу, але дакументамі, якія праўдзіва сведчаць супраць сталінскай тыраніі. І хоць Паэтам напісана багата на дзіва тонкіх лірычных ды вясёлых гумарыстычных вершаў, якія ўвайшлі ў зборнікі "Бяссмертнік" (1994г.), "Заяц на бярозе" (1994г.), "Чарадзейны агонь" (1997г.), распачнём знаёмства чытачоў "Нашага Слова" з творчасцю Самсона Пярловіча менавіта з тых двух вершаў – "Паднімецца крыўда" і "Аб сустрэчы крывавай з эмбістамі Цанавам". Для Памяці. Бо: "Хто згубіў сваю памяць – згубіў усё" (Уладзімір Караткевіч).

Зміцер Цехановіч.

Паэзія супрацьстаяння

Гэты чалавек мог застацца аўтарам адзінага верша "Паднімецца крыўда", які ён 24-гадовым юнаком напісаў у 1947 годзе і за які быў тады ж асуджаны на дзесяць год, прычым яго, як аўтара гэтага верша запрагнуў убачыць, самы галоўны тады ў Беларусі берыевец – Цанава, які проста не мог паверыць, што ў Беларусі змог аб'явіцца нейкі там маладзён, што супраць самога бацькі Сталіна верш напісаў, асмельваецца бунтаваць супраць падхалімаў, якія "скуляць пра росквіт жыцця, пра свабоду", не заўважаючы беспрычынных справаў, гвалту над народам, нечуванай крыўды.

Зрэшты, не зялёным маладзёнам паўстаў малады Самсон Пярловіч перад бязлітасным Цанавым. З маладых людзей, што нарадзілася ў год яго нараджэння – 1923-ці – і прайшлі праз Вялікую Айчынную вайну, як вядома, з сотні засталося пасля вайны па тры чалавекі, — засталося, выйшла з вайны проста цудам, і калі выйшла, то каб не стаць падхалімамі і падпявалами, выцірачымі пад ногі раскілзаных самаўпэўненых сатрапаў. Не скажам, што Самсон, адзін з семярых сыноў малазямельных сялян з вёскі Католышы, што за пяць кіламетраў ад Наваградка, нарадзіўся дужа падобным да героя, бясстрашнага пераможцы, змагара смельчака. Але ўсё ж ён не проста выжыў, а ўсе астатнія яго браты заўчасна зляглі, хто дзе, у роднную і далёкую ад Наваградчыны зямлю. Ужо ў чацвёртым класе польскай школы хлапчук Самсон напісаў верш пра Свіцязь – пад уплывам паэзіі Яна Каспровіча. Быў ён, юны хлапчук, летуценны, надзвычай эмацыянальны, і пагэтаму, можа, найменш прыстасаваны да цяжкасцяў жыцця, якія так рана абрушыліся на яго. У першы год акупацыі, каб абараніцца ад вывазу ў Нямеччыну, ён пачынае настаўнічаць у пачатковай школе ў суседняй ад роднай вёскі Байкі. Але тое ўратоўвала толькі да 20 жніўня 1943 года, калі настаўнік быў схоплены і павезены. Цягнік ішоў не на захад, - на поўнач, на Рыгу. Першыя ўцёкі былі з таго цягніка – на шалёнай хуткасці. На жвірысты насып. Іх кінулася тады з вагона трое, трох – у крававых падцёках, падбітых – іх тут жа схапіла латышская жандармерыя. Пачаліся жорсткія допыты, этап на Лібаву, першы лагер за калючым дротам, прымусовая праца на ліцейным заводзе. У бараку пачалася эпідэмія. На цэлы месяц да нараў прыкавала дыфтэрыя. А сябар па першых уцёках тым часам адкладваў пайку на новыя ўцёкі, разведваў маршрут. Здавалася, што на гэты раз шчасціла. Вымкнулі на "кукушцы" у Літву, мінулі Каўнас, Вільню. Два тыдні ўжо былі вольныя. Блізка ўжо былі беларускія Беняконі, ды на паўстанку Стасілы – аблавы. І зноў – краты ў Янушах, Вільні, Граеве, а там і далёка за межамі рожнага краю, бо аж над Дунаем, у Вене – да 10 красавіка 1945 года, да вызвалення Савецкай Арміяй, воінам якое з 1 Мая 1945 года стаў і былы зняволены фашысцкіх лагераў Самсон Пярловіч.

Быў зняволены абставінгамі, ды не духам. Бо вершы пісаў, нягледзячы ні на што. Памятае, у вёсцы Індзілінкі, дзе ад арышту выручыла добрасардэчная сялянка, закінуў іх употай ад вока паліцая – разам з картай – за куфар, не змогшы затым узяць іх зноў за пазуху. У Вене пісаў у памяці, чытаў сябрам. Запісаць, схаваць не было дзе. Вершы былі – не як першы пра Свіцязь, — дыктавалі гора і пратэст, мужнасць, супрацьстаянне…

Што супрацьстаяць прыйдзецца самому грознаму сатрапу Беларусі Цанаве, тады і падумкі быць не магло. А вось супрацьстаў – а ўпэўненасцю, што крыўды гісторыя не даруе, што сумленнасць пераможа. І супрацьстаянне прадоўжылася, — у следчай турме Баранавіч Крывое Кола, нараджаючы аднайменны верш і ў Комі ля Усць Вымракі, нараджаючы вершы "Без білета", "Тайга", "Праўда ў аковах", "Белы мядзведзь": у Казахстане, у Карагандзе (вершы "Раз'юшаны вые і свішча…", "Паўночная серэнада"). Аўтарам аднаго верша Самсон Пярловіч не астаўся, хоць два гады пакутаваў на лясным павале рэчак Усць і Вым, чатыры гады будаваў шахты ў Карагандзе, перакінуты з лютых марозаў у нясцерпную спеку. Шахты імя Кастэнкі, 107-я, 120-я. Бурыў стваы, прабіваў штрэкі, ставіў мацаванні (яму здавалася, з беларускай сасны). Стваалы, рукаятчык, ён, вярнуўшыся восенню ў 1956 годзе ў Наваградак, не ў рэдакцыю раённай газеты пайшоў, адкуль быў зняты з работы, арыштаваны, а на завод, дзе і сёння працуе. Наваградскі завод газавай аппаратуры. 33 гады ўжо, як ніхто лепш яго не зробіць разца, не заточыць фрэзу, зенкер. Трыццаць гадоў таму назад ён, пэўна, здзівіў сваіх адназаводчыкаў, калі ў раёнцы "Звязда" надрукаваў упершыню верш "Рабіна". За трыццаць гадоў ён стаў папулярным аўтарам раёнкі, бо не толькі пра родную прыроду, гісторыю Наваградчыны, але і шмат жартоўных вершаў у ёй надрукаваў. Ды і песні, створаныя на яго словы мясцовымі кампазітарамі Яўгенам Цікановічам, Мар'янам Наско, Юрыем Талеснікам, Марыяй Даронінай, стала співаць Наваградчына, у цэлым так дасюль амаль не ведаючы, што не толькі пра красу роднай прыроды ёсць вершы ў гэтага натхнёнага, маладжавага тварам рабочага чалавека з густым чубам даўно пасівелых валос…

Кніга Самсона Пярловіча "Бяссмертнік" – гэта наперш кніга яго жыццёвага лёсу, асабліва сваім першым раздзелам – "За калючымі дратамі…". І гэта разам з тым і кніга народнага лёсу, складаных гістарычных шляхоў, якімі беларусы ішлі праз XX стагоддзе. І гэтая кніга асабліва каштоўная тым, што ўразмаічвае карту беларускай літаратуры пасляваеннага часу, дасюль нам вядомую, узбагачае яе вобразамі і матывамі. Вершы ў гэтай кнізе – не з шуфляды прафесійнага паэта, да часу тоеныя. Яны з сэрца наўрымслівага, гарачага, пратэстуючага. Іх даверліва чытаў аўтар сваім сябрам, суайчыннікам, іх слухалі людзі, яны – вершы Самсона Пярловіча – факт гісторыі нашай літаратуры, гісторыі нашага народа, якога культавыя вершы ніколі цалкам не аглушалі, прага справядлівасці ў якім ніколі не гасла, а крыўда выклікала пратэст, супрацьстаянне, якога нельга не палічыць гераічным. Няхай прафісіянальнай школы ў Самсона Пярловіча ў вершах ідылічна-пейзажных, якія культавала не адна толькі наваградская "Звязда", больш, чым у яго лагернай лірыцы, ды, думаецца, што любы сённяшні чытач цалкам зможа даценіць значэнне выявы самой рэальнай школы жыцця, што дае нам лагерная лірыка Самсона Пярловіча. Тут паэзія не тонкіх нэансаў, сакрэтаў эмацыянальнай сілы, слова, і яго мудрасці. Тут – лёс, суровы, нібы знаркавы забойца, здзекліўец, крыўдзіцель якому, здавалася б, супрацьстаяць – сіл няма, не хопіць, не стане. А сіл знайшлося, хапіла, стала. І выявай таго найперш і няхай парадуе нас паэзія Самсона Пярловіча з яе першасным вобразам у ёй – бяссмертніка, кветкі як сімвал бяссмерця і паэзіі і народа.

Алег Лойка

Ад рэдакцыі. Вершы Самсона Пярловіча будуць надрукаваныя ўнаступным нумары.

Давайце співаць па-беларуску

Сл. і музыка Эдуарда Акуліна

Пагоня

(У тэмпе марша)

Am
Прыземістыя коні
E
іржуць пад седакамі.
E
Трапеча сцяг з Пагоняй
Am
Над Вітаўта палкамі.
Am
Яшчэ забралы ўзняты
Dm
І меч незатупелы,
Dm Am
патрапіць праміж латаў *2 разы*
E Am
Яшчэ не мецяць стрэлы

Прыпеў:

E Am Dm
Пагоня! Ляціць Пагоня!
Gm C
І коні хрыпяць наўзрыд.
E
пяюць наўзрыд…
E Am Dm
А воля на ратным полі
E Am
Мільгнула між лесу дзід.

II
А ў сонечным бязмежжы
Лунае горда бусел, —
Як сімвал незалежнай,
Свабоднай Белай Русі…
Яшчэ забралы ўзняты
І меч незатупелы.
Патрапіць паміж латаў
Яшчэ не мецяць стрэлы.

Прыпеў:

КУПАЛЛЕ

У ноч на Івана Купалу ў гарадскім пасёлку Руба, што пад Віцебскам, прайшло фальклорнае свята "Купальская ноч".

На здымках:

1. Іна Казлова на свяце.
2. Фрагменты свята "Купальская ноч".

Фота Аляксандра Хітрова, БЕЛТА. – О – ТА/ТМ





Рэдактар Станіслаў Суднік

Заснавальнік: ТБМ імя Францішка Скарыны.
Пасведчанне аб рэгістрацыі: № 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.
Адрас рэдакцыі: 220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
Адрас для паштовых адпраўленняў: 231300, г. Ліда-2, п/с 7.
E-mail: ns@lida1.lingvo.grodno.by

Рэдакцыйная калегія:
Людміла Дзіцэвіч, Алесь Гурыновіч, Леакадзія Мілаш, Язэп Палубятка, Алесь Петрашкевіч, Лілея Сазанавец, Уладзімір Содаль, Станіслаў Суднік, Павел Сцяцко, Алег Трусаў.

Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзеных інфармацыі

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні.. 231300, г.Ліда, вул. Ленінская, 23.
Кошт па дамове.Газета падпісана да друку 19. 07. 99 г.
Наклад 3500 асобнікаў. Замова № 1891.
Падпісны індэкс: 63865.
Кошт падпіскі: 1 мес.- 40 000 руб., 3 мес.- 120 000 руб.
Кошт у розніцу: 10 000 руб.